

ЧАГО КАШТУЮЦЬ ХАТНІЯ ТВАРАЖОК І ГАРОДНІНА

7

ПАСЯЎНЫ КАЛЯНДАР НА 2022 ГОД

8–9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 СТУДЗЕНЯ 2022 г. АЎТОРАК № 15 (29637)

## ЛІЧБА ДНЯ

**1675,3 рубля**

*склала намінальная налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Беларусі ў снежні мінулага года, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. У лістападзе сярэдняя заработная плата работнікаў складала Br1476,3. Даныя прыводзяцца да выліку падаходнага падатку (13 %) і абавязковых страхавых узносаў у Фонд сацабароны (1 % з заробкаў работнікаў). У разрэзе рэгіёнаў лідзіруе сталіца: сярэдні заробак мінчан у снежні быў Br2404,1 (тэмп росту рэальнага заробку да снежня 2020 года — 100,5 %). У Мінскай вобласці яна склала Br1711,9 (108,3 працэнта), Гомельскай — Br1475,8 (106,1 працэнта), Брэсцкай — Br1459,5 (102,9 працэнта), Гродзенскай — Br1423,1 (101,4 працэнта), Віцебскай — Br1354 (101,5 працэнта) і Магілёўскай — Br1286,8 (99,5 працэнта). У цэлым па краіне рэальная заработная плата (разлічаная з улікам росту спажывецкіх цэн на тавары і паслугі) у студзені — снежні ў параўнанні з 2020 годам узрасла на 4,4 працэнта. Больш за ўсё атрымлівалі работнікі сферы інфармацыйных тэхналогій і дзейнасці ў сферы інфармацыйнага абслугоўвання (Br6435,5). Менш за ўсё налічана работнікам цырульняў і салонаў прыгажосці (Br810,6).*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «БЯСПЕКА НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ ПАЧЫНАЕЦЦА З ГРАНІЦ»



Фота БелТА.

## Прэзідэнт зацвердзіў рашэнне аб абароне Дзяржаўнай граніцы на 2022 год

**Даклад старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Анатоля Лапо працягнуў шэраг сустрэч Аляксандра Лукашэнкі з прадстаўнікамі сілавога блока краіны. Дзяжурнае штогадовае мерапрыемства на працягу гэтых месяцаў атрымала асаблівую важнасць. Міграцыйны крызіс, згортванне супрацоўніцтва па пагранічных пытаннях з краінамі Еўрапейскага саюза, нарошчванне колькасці ўкраінскіх ваенных побач з нашай граніцай — усё гэта дае падставы для змястоўнай размовы ў Палацы Незалежнасці. Як потым падзеліцца з журналістамі Анатоль Лапо, мінулы год беларускім пагранічнікам запомніцца як асабліва напружаны. Праблемы «прыйшлі» здалёк — прычым у прамым сэнсе, калі казаць пра бежанцаў, і адкуль іх не чакалі — з боку суседзяў-украінцаў. Калі раней, успамінае галоўны пагранічнік краіны, беларуска-ўкраінскую граніцу ўмацоўвалі сумесна, то сёлета асноўныя нашы намаганні ў абароне рубяжоў засяродзяцца на паўднёвым напрамку. Тое, што Украіна будзе сябе так ваяўніча паводзіць, стала адкрыццём для бывалых генералаў. Верагодна, многія з іх у сваім афіцэрскім юнацтве хадзілі ў адным строі з украінскімі саслужыўцамі ў тыя часы, калі граніцу не дзялілі на сваю і чужую.**

СТАР. 2

# На «белазаўскай» горцы



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Жодзіне, зусім побач з аўтамабільным заводам, дзе робяць вядомыя ва ўсім свеце самазвалы, у марозную, як цяпер, пару дзеці з бацькамі весела бавяць час на снежнай горцы.

## КОРАТКА

- **На агародніну і садавіну, якія раней не ўвозіліся ў Беларусь, будзе асаблівы парадак цэн.**
- ДАІ: у 2021 годзе больш як 35 працэнтаў ДТЗ учынены па віне пешаходаў.
- **Студэнты ВНУ змогуць трапіць на практыку ў МЗС, прыняўшы ўдзел у конкурсе эсэ.**
- Патрыятычны праект «Зімовы маршрут» пройдзе па двух раёнах Віцебскай вобласці.

ISSN 1990 — 763X

Камунальныя тэхналогіі

# ПАКЕТЫ З КУКУРУЗЫ ВЫРАТУЮЦЬ ЭКАЛОГІЮ?

## Як кампасціраванне арганікі дапаможа паменшыць смеццевую праблему



**Беларусь амбіцыйна плануе да 2035 года выкарыстоўваць 90 % цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА) замест таго, каб захоўваць іх на смеццевых палігонах (цяперашняя лічба — 25 %). Згодна з марфалагічным складам смецця, з яго можна выбраць да 30 % другасных матэрыяльных рэсурсаў (пластыку, шын, гумы, шкла, металу, паперы) і 40 % арганічнага смецця («зялёныя» адходы ад абрэзкі дрэў і кустоў, зелле з агародаў, а таксама харчовыя адходы). А вось 30 % адходаў не прыдатныя да другаснага выкарыстання. У краіне плануюць стварыць магутнасці па перапрацоўцы арганічных адходаў біялагічнымі метадамі, і да 2035-га іх выкарыстанне павінна дасягнуць 535 тысяч тон (пакуль перапрацоўваецца каля 2 % арганікі). А летась у Слоніме пачаўся праект па правільным кампасціраванні арганікі, у якім удзельнічае каля 500 домаўладанняў. Пра планы на карысць ад смецця і асаблівасці абыходжання з ім цяпер расказалі спецыялісты.**

СТАР. 4

# «БЯСПЕКА НАШАЙ ДЗЯРЖАВЫ ПАЧЫНАЕЦЦА З ГРАНІЦ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пра тое, што мінулы год для айчынных пагранічнікаў быў складаным, добра ведае Прэзідэнт і заўважае: леташнюю сітуацыю на граніцы яшчэ прыйдзецца сур'ёзна прааналізаваць.

«Па маіх адчуваннях (а яны мяне рэдка падманваюць) я павінен сказаць, што ўпершыню за чвэрць стагоддзя, колькі працую Прэзідэнтам, пагранічныя войскі былі на вастрыі і ўпершыню былі праверany ў сапраўднай мужчынскай рабоце. Яны не падвялі», — падзякаваў Прэзідэнт пагранічнікам і іх кіраўніку.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што абаронцы граніц заўсёды гатовы былі падняцца «па трывозе» — кожную хвіліну сітуацыя магла змяніцца.

Як вядома, і кіраўнік краіны гэтага ніколі не хаваў, да пагранічнікаў у яго асаблівае стаўленне. Сам калісьці служыў на граніцы, таму ўсе асаблівасці іх службы ведае на ўласным вопыце. Менавіта ён, вопыт, і сённяшняя баявая дысцыпліна салдат дае падставы казаць: «Нашы пагранічнікі ў поўнай баявой гатоўнасці. Так было, так ёсць і так будзе заўсёды. Малайцы, хлопцы. Пры ўсіх цяжкасцях, што абрынуліся на іх у мінулым годзе, яны з гэтымі праблемамі справіліся. Зразумела, бяспека нашай дзяржавы пачынаецца з граніц. У рамках гэтых граніц забяспечваецца наш суверэнітэт. І асноўны ўнёсак у забеспячэнне суверэнітэту ў мірны перыяд, дзейсныя мерапрыемствы і работа забяспечваецца пагранічнымі войскамі».

Наплыў бежанцаў, канцэнтрацыя замежных войскаў уздоўж заходніх і паўднёвых граніц — айчынным пагранічнікам прыйшлося стаць больш пільнымі і разам з разведкай сачыць за тым, што адбываецца.

Заўважылі яны і тое, што на поўдні Украіна рыхтуецца «абараняцца ад мігрантаў» і пачала спецаперацыю «Палессе» побач з нашымі граніцамі. У процівагу неабходна прымаць пэўныя меры і Беларусі. Таму Аляксандр Лукашэнка папрасіў Анатоля Лапо выказаць сваё меркаванне на гэту тэму і прапанаваць далейшыя дзеянні на ўкраінскім напрамку.

Пагрозу бачаць некаторыя замежныя палітыкі і ў сумесных вучэннях Саюзнай дзяржавы, якія хутка маюць адбыцца. Трактуюць іх па-свойму і апаненты беларускай улады.

«Многія вялікія рашэнні ўжо былі прыняты. Тым не менш абстаноўка ўвесь час ускладняецца. Пераводзяць стрэлкі на нашы сумесныя вучэнні з Расійскай Федэрацыяй. Я ніколі не апускаўся да такога ўзроўню, каб палемізіраваць са сваімі супраціўнікамі. Сёння, атрымаўшы агляд (размова ідзе пра агляд інфармацыйных рэсурсаў. — **«Зв.»**), я са здзіўленнем прачытаў, што ў нас адбылася акупацыя Беларусі. Я як Галоўнакамандуючы неяк не заўважыў. Можа, вы мяне не праінфармавалі, што ў нас ажыццёўлена акупацыя Беларусі?» — звярнуўся Прэзідэнт з жартаўлівым пытаннем да сурамоўцы і працытаваў яму словы з агляду: «Уведзены войскі, працэс увядзення расійскіх войскаў на нашу тэрыторыю працягваецца, павінны прыехаць сюды 200 цягнікоў па 50 вагонаў. Гэта ў сярэднім будзе 80—100 тысяч жывой сілы, плюс уся тэхніка. Прапісаны ўвесь план акупацыі. Зянон Пазняк».

Кіраўнік краіны звярнуўся да асобы, словы якой ён працытаваў, — Зянона Пазняка. Аляксандр Лукашэнка назваў дзеяча антыподам яго палітыкі і заважыў, што добра ведае Зянона Пазняка. «Чалавек недурны, разумее ўсё. Яны ўсе, збеглыя нашы, вельмі далёкія ад яго ў плане разумення», — зрабіў акцэнт Прэзідэнт.

Ён абвяргае выказванні апанентаў тэзісам, што ў 200 цягніках не можа змясціцца ні заяўленая колькасць вайскоўцаў, ні тэхнікі.

«Дзвесце чыгуначных саставаў такога не змесцяць. Гэта элементарна палічыць, нават калі ты не ведаеш, што такое армія і не служыў там ніколі. Гэта простая школьная арыфметыка. Але справа не ў тым. Чаму я падкрэсліў гэта? Атрымліваючы інфармацыю ад разведкі, КДБ, пагранічнікаў, ваш аналіз, я, думаю: дзе ж ты быў, барацьбіт за суверэнітэт і незалежнасць у 20-м годзе, калі нас восьвось гатовы былі акупаваць? Чаму тады не абараняў суверэнітэт і незалежнасць?» — сказаў Прэзідэнт.

Ён звярнуўся да аўдыторыі, якая з сур'ёзнасцю ўспрыняла выказванні палітычных апанентаў наконт «акупацыі».

«Ніколі, пакуль я Прэзідэнт і вы генерал, мы не дапусцім акупацыі Беларусі. Гэтага не будзе ніколі ні з якога боку — ні злева, ні справа, ні з захаду, ні з усходу, поўначы ці поўдня. Ніколі. Мы памром, але гэтага не дапусцім. Не трэба спекуляваць на гэтай тэме», — заявіў кіраўнік краіны.

Па яго словах, пра беларускарасійскія вучэнні было аб'яўлена загадзя. Прэзідэнт нагадаў, што мерапрыемства важнае, бо на паўднёвай граніцы прыйдзецца разгарнуць цэлы кантынгент беларускай арміі.

«Падобным палітыкам неабходна звярнуць увагу на канцэнтрацыю войск не толькі на граніцы Латвіі, Літвы, Польшчы, але і Украіны. Не мы першыя пачалі звяртаць увагу на нашу паўднёвую граніцу. Украінцы пачалі сцягваць туды войскі, не разумею, навошта», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Апошнія некалькі тыдняў у еўрапейскай прасторы ходзяць чуткі аб ваяўнічых планах Расіі па ўварванні ва Украіну. Паніку наводзяць еўрапейскія сродкі масавай інфармацыі, прадстаўляючы схемы і карты магчымай вайны, і міністэрствы замежных спраў, якія рэкамендуюць сваім пасольскім работнікам пакінуць Кіеў. Так, ЗША, Аўстралія ўжо пачалі рыхтаваць ад'езд сваіх дыпламатаў, за імі ўслед збіраюцца і брытанцы. Закранулі гэтыя непаразуменні і нашу краіну.

З пагражальнай пазіцыяй у адносінах да Беларусі выступіў Дзяржаўны дэпартамент ЗША. Вось што расказаў пра гэта Прэзідэнт.

«Прыехалі да нашых дыпламатаў у Нью-Ёрку і пагражаюць нам: «Калі вы дазволіце Пуціну і Расіі, дазволіце гэта і тое, то мы ўвядзём санкцыі, калі вы вернеце ядзерную зброю ў Беларусь, будзе тое і гэтае». Гэта ментарскі тон у адносінах да Беларусі», — дзеліцца кіраўнік краіны.

У адказ ён звяртае ўвагу на тое, што сказаў у Лунінцы падчас наведвання вайсковай часці, а менавіта: нам не трэба ніякай вайны.

«Але гэтыя ж амерыканцы рукамі палякаў, латышоў і самі асабіста падштурхоўваюць нас да такіх дзеянняў. Мы былі донарам бяспекі ў рэгіёне, нас цанілі за гэта. Навошта вы нас у 20-м годзе штурхаеце і робіце «агрэсарамі»? А зараз нам пагражаюць. Нам ужо горш не зробіш. Калі вы хочаце нас увогуле паставіць на мяжу бездані, вы ведаеце, як мы будзем на гэта адказваць», — паведамляе Аляксандр Лукашэнка.

Ён папярэдзіў старшыню Дзяржпагранкамітэта, што з нагоды развіцця сітуацыі вакол краіны, дзеянняў Вашынгтона сітуацыя на граніцы, на жаль, лепшай за леташнюю не будзе і прыйдзецца абараняцца.

«Мы гэта ўмеем рабіць і гэта зробім. Я ў гэтым нават не сумняваюся. А тое, што нас тут пужаюць, папракаюць, хай вернуцца да сваіх дзеянняў. Навошта Еўрапейскі саюз згарнуў супрацоўніцтва па лініі пытанняў граніцы? Яны ж згарнулі гэта супрацоўніцтва. Не мы пайшлі на эскалацыю», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён заслухаў прапановы Анатоля Лапо па абароне дзяржаўнай граніцы ў бягучым годзе і прыняў адмысловае рашэнне аб гэтым.

## Каментарый у тэму

### «Асноўныя намаганні ў ахове і забеспячэнні граніцы будзем засяроджваць на ўкраінскім напрамку»

**Анатоль ЛАПО, старшыня ДПК,** заўважыў журналістам, што 2021 год быў асаблівы па сваёй напружанасці для пагранічнікаў — ніколі каля нашых граніц не было такой канцэнтрацыі войскаў памежных дзяржаў: «Вазьміце польскі напрамак. Зараз на граніцы стаіць 15 тысяч чалавек. На кожных 200 метрах па 7-8 чалавек плюс палатка. Навошта яна? Напружанасць... Вазьміце правакацыі: абстрэл нашых пагранічных слупоў, знішчэнне на польскім напрамку шчыткоў».

Галоўны пагранічнік краіны заўважыў, што любы пагранічны канфлікт пачынаецца з дробязяў. І Прэзідэнту ён далажыў, як не дапускаць перарастання дробязяў у поўнамаштабныя канфлікты.

«Сумежны бок нас да гэтага штурхае. Але мы, пагранічнікі, людзі адэкватныя, памяркоўныя, заўсёды ацэньвалі абстаноўку. Адразу скажу: бяспека нашай дзяржаўнай граніцы будзе забяспечана любым спосабам. Сілы і сродкі ў нас для гэтага ёсць», — падкрэсліў старшыня ДПК.

Анатоль Лапо расказаў, што ніколі не чакалі такога абвастрэння адносін з Украінай. І нават сёння для належнай аховы граніцы сумесных сродкаў дастаткова пры ўзаемавыгадным супрацоўніцтве.

«Дзесьці засяроджвалі намаганні мы, дзесьці — яны: мы граніцу абаранялі сумесна. Але да іх прыйшлі іншыя гаспадары, інструктары і паставілі іншыя задачы. Зразумела, абстаноўка змяняецца. Я Прэзідэнту далажыў, што сёлета асноўныя намаганні ў ахове і забеспячэнні граніцы мы будзем засяроджваць на ўкраінскім напрамку і на асобных напрамках, дзе, лічым, будуць пагрозы нашай бяспецы», — патлумачыў старшыня Дзяржпагранкамітэта.

# ПРА КАРУПЦЫЮ, АПК І ГІСТАРЫЧНУЮ ПАМЯЦЬ

## Учора таксама Прэзідэнт прыняў з дакладам Генеральнага пракурора Андрэя Шведа

**Кіраўнік кантрольнага ведамства расказаў пра вынікі работы праваахоўнага блока за 2021 год. Асабліва ўвагу ў дакладзе па просьбе Прэзідэнта Андрэй Швед звярнуў на крымінальныя справы па экстрэмісцкай дзейнасці, важнае месца ў размове ўдзялілі і тэматыцы генацыду беларусаў падчас Вялікай Айчыннай вайны.**

«Работа па генацыдзе — вельмі шырока гэта асвятляецца. Знайшлася падтрымка ў нашага народа. На якім этапе, на якім узроўні мы знаходзімся? Тут, вядома, будзе пастаянная работа. Дзякуй Богу, што старыя яшчэ жывыя, якія нам падказваюць, у якім кірунку працаваць і дзе шукаць факты ў нашай зямлі. Раскопкі маштабныя ідуць па Беларусі, — задаў кіраўнік краіны яшчэ адну тэму размовы. — На якім мы этапе знаходзімся? Калі прад'явім у поўным аб'ёме міжнароднай супольнасці твар людзей, нашчадкі якіх сёння ходзяць вакол Беларусі і разам са збеглымі ў Польшчы, Літве і іншых краінах, у тым ліку і Украіне, спрабуюць пранікнуць на тэрыторыю Беларусі, каб трапіць тут пад артыкул экстрэмісцкі?»

Прэзідэнт папрасіў Генпракурора звярнуць значную ўвагу на праблему карупцыі ў краіне. Раней, дзеліцца Аляксандр Лукашэнка, яму асабіста даводзілася займацца гэтай праблемай.

«Безумоўна, я нікуды не сыду ад кантролю за гэтымі працэсамі, але хацеў бы, каб вы сур'ёзную ўвагу звярнулі на барацьбу з карупцыйнымі праявамі ў нашым грамадстве», — дадаў Прэзідэнт.

Яшчэ адно пытанне на парадку сустрэчы — АПК, у якім, па звестках кіраўніка краіны, занадта праблем, перадусім з падзяжом жывёлы.

«Як ідуць справы? Як працуюць пракуроры на месцах для спынення падобнай практыкі?» — запытаўся ў завяршэнне Аляксандр Лукашэнка.

**Генпракурор Андрэй ШВЕД** паведаміў, што колькасць зарэгістраваных злачынстваў у мінулым годзе знізілася на 8 % — у тым ліку злачынствы супраць асобы: забойствы, згвалтаванні (менш на 5 %). На 7 % менш людзей пакутавалі ад рук зладзеяў. Таксама сурамоўца расказаў кіраўніку краіны па выяўленне наркапагрозы, выкараненне карупцыі, навядзенне парадку ў АПК, абарону правоў непаўналетніх.

«Прыняты меры па навядзенні парадку з дзіцячым харчаваннем у школах, па забеспячэнні мер бяспекі дзяцей, выключэнні фактаў траўматызму. Нагадаю, што ў нас была сур'ёзная праблема з работай атракцыёнаў. Не было мінімальных мер бяспекі, дзеці не толькі траўміраваліся, былі і факты гібелі», — звярнуў увагу Андрэй Швед.

Па яго словах, у мінулым годзе завершана расследаванне асноўных спраў па экстрэмісцкіх артыкулах, звязаных са спробай дзяржперавароту.

Усяго судамі разгледжана каля 1200 крымінальных спраў, па якіх асуджана больш чым 1600 чалавек.

Па даручэнні кіраўніка краіны Генпракуратура падрыхтуе нараду, якая запланавана на будучы месяц, па рабоце сілавога блока. На ёй плануецца выступленне Генпракурора па праблемных пытаннях і справаздачы ўсіх сілавых ведамстваў па недахопах, выяўленых пракуратурай у паўсядзённай дзейнасці.

«Гэта новы фармат. Ён накіраваны на тое, каб апаратыўна з улікам вынікаў наглядчыцкай дзейнасці пракурораў абмяркоўваць недахопы і прыняць меры па іх выдаленні, у першую чаргу ў рабоце праваахоўнага блока», — падкрэсліў Андрэй Швед.

Асобнай тэмай на дакладзе стала расследаванне спраў аб генацыдзе насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Андрэй Швед заўважыў, што Беларусь — адзіная краіна на постсавецкай прасторы, якая праводзіць паўнацэннае расследаванне такіх фактаў. Ужо дапытана 12,5 тысячы чалавек, агледжана 300 месцаў масавых пахаванняў. У будучыя гады плануецца даследаваць яшчэ некалькі соцень раней не вядомых месцаў масавага знішчэння мірных грамадзян.

Па словах Генпракурора, маштабы трагедыі 1940-х яшчэ належыць ацаніць.

«Я абазначу, што афіцыйная лічба нявінна забітых і замучаных людзей у Трасцянцы больш як 200 тысяч. Сёння мы маем дакументы і сведчанні, што ў Трасцянцы было знішчана не менш за 546 тысяч чалавек. Выяўляюцца новыя факты, і размова ідзе, што ўжо колькасць знішчаных мірных грамадзян на тэрыторыі БССР складае каля трох мільёнаў чалавек. Гэта лічба будзе ўдакладняцца. Маштабы таго, што было ў нашай краіне ў гады Вялікай Айчыннай вайны, яшчэ належыць сур'ёзна асэнсаваць», — мяркуе Андрэй Швед.

Ён дадаў, што Прэзідэнт краіны падтрымаў ідэю правесці сёлета міжнародную канферэнцыю па пытаннях генацыду насельніцтва БССР у гады ВАВ. Аляксандру Лукашэнку перададзены праект інфармацыйна-даведачных матэрыялаў аб злачынствах, што былі здзейснены акупантамі і калабарантамі ў 1940-я гады. Калі ён будзе ўхвалены кіраўніком краіны, гэтыя звесткі вышлюць генпракурорам 180 краін свету.

**Матэрыялы падрыхтавала Марыя ДАДАЛКА.**

# «САЦЫЯЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ КОЖНАГА — ВЕЛЬМІ ВАЖНЫ АСПЕКТ»



**Сярод значных паправак у Асноўны Закон нашай краіны ёсць тыя, што датычацца галоўных інтарэсаў кожнага з нас. Яны звязаны са здароўем і сацыяльнай падтрымкай. Безумоўна, пытанні аховы здароўя і сацыяльнай палітыкі выклікаюць павышаную цікавасць грамадзян. Што можа змяніцца ў актуальных для кожнага беларуса пытаннях? Чаму так важна замацаваць у Канстытуцыі пастулат пра абавязак кожнага клапаціцца пра сваё здароўе? Аб гэтым наша размова з генеральным сакратарам Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Дзмітрыем ШАЎЦОВЫМ.**

***— Дзмітрый Яўгенавіч, адна з паправак прапануе, каб грамадзяне прымалі меры па захаванні і ўмацаванні ўласнага здароўя, што і знайшло адлюстраванне ў дапаўненні да артыкула 45 Канстытуцыі. З якіх меркаванняў уносіцца такая змена і што вы як урач думаеце на гэты конт?***

— Раней наша Канстытуцыя гарантавала толькі права на атрыманне бясплатнай медыцынскай дапамогі — за кошт бюджэту. Пра адказнасць самога чалавека за захаванне здароўя размова не ішла. Лічылася, што ўсе мы апрыёры цэнім сваё здароўе. Я як медык лічу, што чалавечы арганізм — гэта самадасканалы механізм, і калі яго правільна эксплуатаваць, то працаваць ён можа вельмі доўга. Разам з тым як урач я бачу, як праводзіцца дыспансерызацыя, а гэта досыць вялікая нагрузка на бюджэт, бо раз на год кожнага чалавека трэба абследаваць, каб выявіць у яго фактары рызыкі развіцця тых ці іншых хвароб ці калі яны ўжо ёсць, карэкціраваць іх. Мы часта сутыкаемся з тым, што на ўзроўні пярвічнага звяна — у паліклініках — па пяць-шэсць разоў медыцынскія работнікі запрашаюць людзей на дыспансерызацыю, а яны не з'яўляюцца. А калі прыходзяць, мы бачым, што ў 20 % і нават больш нашага насельніцтва няма прыхільнасці да выканання тых рэкамендацый, якія дае ўрач.

Класічны прыклад — 40-гадовы, малады яшчэ мужчына, але доктар выяўляе шэраг фактараў рызыкі: атлусценне, ён курыць, яшчэ не крытычна, але злоўжывае алкаголем, вядзе малярухомы лад жыцця і як вынік мае гіпертанічную хваробу. Урач яму дае рэкамендацыі: сесці на дыету, знізіць вагу, дадаць фізічнай актыўнасці, пастарацца кінуць курыць. Праз год ці два ў яго з'яўляецца яшчэ больш фактараў рызыкі, бо пацыент не прытрымліваецца ніякіх рэкамендацый. Таму і атрымліваецца, што ў 45 гадоў здараюцца інсульты, развіваецца цукровы дыябет. Гэта тыя захворванні, якіх можна не дапусціць.

Атрымліваецца замкнёнае кола: калі ў чалавека здараецца бяда, псіхалагічна ён не можа прызнаць, што сам вінаваты. Ён шукае вінаватага сярод работнікаў сістэмы аховы здароўя. Яны тут і цяпер мусяць даць яму новае здароўе. А дзе ж мы самі былі, калі нас папярэджвалі?

Усе мы, набываючы новы аўтамабіль, стараемся яго правільна эксплуатаваць: мяняем масла, фільтры, бо, калі зламаецца рухавік, аднаўляць вельмі дорага. А вось за сваім «рухавіком», якім з'яўляецца сэрца, на жаль, сочым не так пільна. Таму адзін раз на год важна зрабіць тэхагляд уласнага арганізма, што забяспечвае дзяржава, і ўрач падкажа, на што звярнуць увагу. Калі б усе пацыенты прыслухоўваліся, было б вельмі добра...

Калі такая адказнасць за захаванне свайго здароўя будзе прапісаная ў Канстытуцыі, мы зможам павярнуць чалавека тварам да тых праблем, якія ў яго ёсць. Тут можна казаць пра абавязак выконваць рэкамендацыі медыцынскіх работнікаў. Таму гэты момант вельмі важны.

***— Таксама прапануецца замацаваць у праекце захаванне сацыяльнай накіраванасці беларускай дзяржавы, у тым ліку ў выглядзе бясплатнай аховы здароўя, адукацыі, сацыяльнай абароны інвалідаў, клопату аб моладзі і пажылых...***

— Мы заўсёды былі дастаткова моцна сацыяльна арыентаванай дзяржавай. За апошнія дзесяцігоддзе шмат чаго зроблена ў плане сацыяльнай падтрымкі, асабліва для ўразлівых груп насельніцтва. Гэта і маладыя і шматдзетныя сем'і, і меры па стымуляванні нараджальнасці, і падтрымка інвалідаў і дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечных умовах, і мацярынскі капітал, і забяспечанасць жыллём — усё гэта вельмі важна. Калі праводзіш сустрэчы ў працоўных калектывах, то першае пытанне, якое цікавіць людзей: ці застаецца сацыяльная падтрымка насельніцтва? Для людзей гэта надзвычай важна.

Неабходна сказаць, што ў прапанаваным праекце Канстытуцыі яна не проста захоўваецца, а некаторыя рэчы прапісваюцца асобна. Найперш сацыяльная адказнасць кожнага, чаго раней не было. Дзяржава мусіла пра ўсіх клапаціцца і за ўсіх адказваць. Гэта, канешне, добра, але мы разумеем, што ёсць частка людзей, якія будуць імкнуцца стаць сацыяльнымі ўтрыманцамі. Дык вось тут прапісваецца сацыяльная адказнасць кожнага. Мы кажам пра тое, што не толькі за фізічнае здароўе чалавек павінен быць адказны. Калі ты працуеш і зарабляеш і можаш дапамагчы іншаму, то трэба гэта рабіць. Бо ты жывеш у соцыуме, і побач ёсць людзі, якія маюць патрэбу ў сацыяльнай падтрымцы. Ёсць дзяржава, ёсць яе структурныя падраздзяленні накшталт тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, ёсць арганізацыі, якія працуюць для гэтых мэт, але кожны чалавек мусіць апекавацца тымі, каму патрэбна дапамога.

Не павінна быць такога, каб нашым медыкам і педагогам ставілі ў дакор, што мы, маўляў, плацім падаткі і нас абавязаны забяспечыць якаснай медыцынай і адукацыяй. Чалавек і сам павінен імкнуцца захаваць здароўе і атрымаць веды і навыкі. Гэта вельмі важны аспект — сацыяльная адказнасць кожнага.

Яшчэ адзін важны момант — сацыяльная інтэграцыя інвалідаў. Гэта наступны крок дзяржавы ў названым кірунку. І яго могуць дазволіць сабе толькі вельмі развітыя еўрапейскія краіны са стабільнай эканомікай. Калі гэта будзе прапісана ў Асноўным Законе — Канстытуцыі, то і пасля будуць распрацоўвацца законы, падзаконныя акты, накіраваныя на тое, каб людзі з інваліднасцю былі паўнапраўнымі членамі грамадства. Мы ўжо даўно працуем у такім кірунку, але павінен з'явіцца паскаральны імпульс на шляху сацыяльнай інтэграцыі людзей з інваліднасцю.

**Старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя Вячаслаў ШЫЛА:**

## «Стан здароўя залежыць ад намаганняў самога чалавека»

— Гаворачы аб адказнасці кожнага беларуса за захаванне ўласнага здароўя, якая знайшла адлюстраванне ў прапанаваным дапаўненні да артыкула 45, адзначу, што гэты пастулат прапанаваны членамі Канстытуцыйнай камісіі, у прыватнасці медыкамі, якія працавалі ў яе складзе. Медыцынскія работнікі заўсёды падкрэслівалі, што стан здароўя залежыць не столькі ад сістэмы аховы здароўя, колькі ад намаганняў самога чалавека.

Увогуле, работнікаў галіны аховы здароўя пытанне змяненняў у Канстытуцыю, вядома ж, не магло пакінуць абыякавымі. Безумоўнае адабрэнне ў працоўных у медыцынскім асяроддзі выклікала замацаванне ў праекце захавання сацыяльнай накіраванасці беларускай дзяржавы, у тым ліку ў выглядзе бясплатнай аховы здароўя, адукацыі, сацыяльнай абароны інвалідаў, клопату аб моладзі.

**Старшыня прафсаюзнай арганізацыі Гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі г. Магілёва Таццяна БЯЛЯЦКАЯ:**

## «Новая Канстытуцыя ўмацуе асновы дзяржаўнасці і вызначыць сучаснасць і будучыню краіны»

— Неабходнасць канстытуцыйных змяненняў выклікана патрабаваннямі часу і грамадска-палітычнымі і эканамічнымі падзеямі, якія адбываюцца ў Беларусі. Важна адзначыць сацыяльную накіраванасць новай рэдакцыі Канстытуцыі Беларусі, арыентаваную на ахову асноўных правоў і гарантый кожнага чалавека, а таксама ахову інтарэсаў простых грамадзян і падтрымку людзей, якія знаходзяцца ў складанай жыццёвай сітуацыі. Асаблівая ўвага ўдзелена выхаванню традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, падтрымцы дзяцей і моладзі, клопату аб пажылых людзях і інвалідах, захаванню гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне.

Вельмі важна, захоўваючы даступнасць медыцынскай дапамогі, замацаваць у Канстытуцыі абавязак грамадзян прымаць меры па захаванні і ўмацаванні іх уласнага здароўя. Дзяржава траціць вялізныя сродкі на бясплатнае лячэнне людзей. Асабліва гэта стала заўважна падчас пандэміі. Узяць хоць бы вакцынацыю супраць COVID-19. Медыцынскія работнікі, якія першымі зрабілі прышчэпкі, зараз актыўна заклікаюць грамадзян пайсці па іх прыкладзе. Аднак, на жаль, не заўсёды застаюцца пачутымі. Дакладнае разуменне кожным чалавекам меры асабістай адказнасці і ёсць абавязак грамадзян адказна ставіцца да свайго здароўя.

**Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Ігар СТАРАВОЙТАЎ:**

## «Артыкул 47 Канстытуцыі павінен стаць арыенцірам па ўдасканаленні заканадаўства, якое рэгулюе работу людзей з інваліднасцю»

— На працягу 25 гадоў Беларусь дакладна прытрымліваецца мадэлі сацыяльна арыентаванай дзяржавы, і невыпадкова, што ўжо ў прэамбуле праекта Канстытуцыі падкрэсліваецца важнасць прынцыпаў пабудовы сацыяльна справядлівага грамадства, забеспячэння дабрабыту нашых грамадзян.

Нельга таксама не адзначыць, што праект Канстытуцыі захоўвае пераемнасць з цяперашнім Асноўным Законам, гарантуючы грамадзянам права на працу, яе годную аплату, абарону эканамічных і сацыяльных інтарэсаў, замацоўваючы для работнікаў па найме максімальную працягласць працоўнага тыдня, якая не перавышае 40 гадзін.

У той жа час жыццё не стаіць на месцы. І нараўне з новымі выклікамі ўзнікаюць новыя мэты. Адна з іх — стварэнне роўных магчымасцяў для ўсіх без выключэння грамадзян.

У сувязі з гэтым набывае асаблівае значэнне канстытуцыйнае замацаванне прынцыпу роўнасці для жанчын і мужчын у атрыманні адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі, працы і прасоўванні па службе, стварэнні ўмоў для аховы працы і здароўя, а таксама прынцыпу роўнасці ў адносінах да інвалідаў.

Безумоўна, наша дзяржава і надалей будзе аказваць сацыяльную дапамогу ўсім, хто па аб'ектыўных прычынах мае ў гэтым патрэбу. Але сёння гэтага мала. Таму хацелася б звярнуць асаблівую ўвагу на артыкул 47 праекта Канстытуцыі, які вызначае гарантыі інвалідам для ажыццяўлення правоў і свабод чалавека і грамадзяніна, па стварэнні для іх даступнага асяроддзя, паляпшэнні якасці жыцця, па падтрымцы сем'яў і людзей з інваліднасцю. Па сутнасці, гэты артыкул павінен стаць арыенцірам па ўдасканаленні заканадаўства, якое рэгулюе працоўную дзейнасць людзей з інваліднасцю.

У нашы дні, падчас інтэнсіўнага развіцця IT-тэхналогій, многія з тых, хто мае праблемы са здароўем, могуць працаваць з дому дыстанцыйна. Гэты напрамак будзе развівацца. Таксама прапрацоўваюцца змены ў заканадаўстве ў частцы кватавання працоўных месцаў для людзей з інваліднасцю. Важна адзначыць, што кватаванне не адмяняе інстытут браніравання, прадугледжаны законам аб занятасці насельніцтва.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ДАСЛОЎНА



**Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ:**

— Праект прапанаваных змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь закранае асноўныя інтарэсы грамадзян нашай краіны і базіруецца на магутным сацыяльным блоку.

Беларусь славіцца высокім узроўнем сацыяльнай абароны сваіх грамадзян. Чакана, што пытанні сацыяльнай палітыкі і змены, якія прапаноўваюцца ў праекце Канстытуцыі, выклікаюць павышаную цікавасць з боку насельніцтва. Важна захаваць тое, што мы маем, а таксама прымножыць і актуалізаваць шэраг напрамкаў.

Як і раней, грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права на сацыяльнае забеспячэнне па ўзросце, у выпадку хваробы, інваліднасці, страты працаздольнасці, страты карміцеля і ў іншых выпадках, прадугледжаных законам. Дзяржава працягне праяўляць асаблівы клопат аб ветэранах вайны і працы, а таксама аб асобах, якія страцілі здароўе пры абароне дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў.

У краіне зроблена ўжо шмат для таго, каб людзі з інваліднасцю былі раўнапраўнымі членамі грамадства. І зараз лічу неабходным замацаваць на ўзроўні Канстытуцыі роўныя магчымасці для іх удзелу ў розных сферах: сацыяльную інтэграцыю інвалідаў, стварэнне даступнага асяроддзя і паляпшэнне якасці іх жыцця, падтрымку сем'яў з інвалідамі.

Пры гэтым нельга не закрануць асноўны прыярытэт дзяржавы — моцная і здаровая сям'я. У эру сучасных тэхналогій, папулярызацыі нетрадыцыйных сямейных каштоўнасцяў і разбурэння інстытута павагі да старэйшага пакалення жыццёва важна абараніць для будучых пакаленняў каштоўнасць шлюбу і яго саюза як жанчыны і мужчыны, захаваць падзяку і памяць аб подзвігах нашых ветэранаў. Беларусы — моцная нацыя са шматвяковымі традыцыямі, а абноўленая Канстытуцыя стане моцнай апорай для іх захавання.

**ПОЎНЫ ТЭКСТ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СА ЗМЯНЕННЯМІ І ДАПАЎНЕННЯМІ, ЯКІЯ ВЫНОСЯЦЦА НА РЭФЕРЭНДУМ, ЧЫТАЙЦЕ Ў НУМАРЫ «ЗВЯЗДЫ» ЗА 22 СТУДЗЕНЯ І НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY.**

# ПАКЕТЫ З КУКУРУЗЫ ВЫРАТУЮЦЬ ЭКАЛОГІЮ?

## Харчовыя і «зялёныя»

Яшчэ ў 2019-м у Беларусі назбіралася 3,8 млн тон цвёрдых камунальных адходаў, а ўжо ў 2020-м лічба стала 4,1 млн, і штогод яна працягвае расці. А захоўванне арганічнага смецця на палігонах цягне за сабой шэраг праблем, бо ў гэтай групе адходаў жывуць хваробатваральныя мікраарганізмы і ўтвараюцца парніковыя газы, расказала **Ірына ВАГА, вучоны сакратар Інстытута жыллёва-камунальнай гаспадаркі НАН Беларусі:**

— Цяпер у Беларусі існуе практыка змяшанага збору ЦКА ў адзін кантэйнер. Гэта прыводзіць да забруджвання другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР), зніжае іх якасць і магчымасць вымання са смецця. Харчовыя і «зялёныя» адходы неабходна збіраць паасобку. Каб дасягнуць станоўчага выніку, як сведчыць вопыт іншых краін, неабходны глыбокі селектыўны збор каля крыніц іх стварэння — непасрэдна ад жыхароў. У нашай краіне ўжо ўведзены такія тэхналогіі біялагічнай апрацоўкі арганічнай часткі ЦКА, як анаэробнае кампасціраванне і анаэробнае кампасціраванне з атрыманнем біягазу з наступным выпрацоўкай і выкарыстаннем цеплавой і электрычнай энергіі.

Спецыялісты інстытута ЖКГ даследавалі эканамічныя выгады ад гэтых тэхналогій на прыкладзе існуючых магутнасцяў краіны і прыйшлі да высновы, што найбольш аптымальная для Беларусі тэхналогія — анаэробнае кампасціраванне ў палявых умовах. Папярэднія даследаванні працэсу кампасціравання праводзіліся на базе Слонімскай ЖКГ. Сыравінай служылі драўляна-раслінныя адходы.

— Вынікі паказалі: калі не было асобнага збору арганічнай часткі адходаў, то валавое ўтрыманне свінцу перавышала ў некаторых месяцах гранічна дапушчальную канцэнтрацыю. А вось там, дзе выкарыстоўвалі адходы пасля раздзельнага збору, атрымалі гатовы кампост, утрыманне ўсіх цяжкіх металаў у якім было ў норме. На гэты прадукт атрыманы тэхнічныя рэгламенты, і ён выкарыстоўваецца для ўласных патрэб гаспадаркі — вырошчвання расады, кветак і газонной травы, — агучыла вынікі даследавання спецыяліст.

Цяпер навукоўцы распрацоўваюць тэхналогіі вытворчасці арганічнага ўгнаення арганічнай часткі ЦКА і цэлюлозаўтрымлівальных матэрыялаў. Яны сцвярджаюць, што гэта тэхналогія дазволіць павялічыць аб'ём перапрацоўкі камунальных адходаў на 11—15 %, скараціць час



атрымання арганічнага ўгнаення з шасці да трох месяцаў (за кошт прымянення мікрабіялагічных прэпаратаў), зменшыць затраты на працэс кампасціравання на 15—25 % і павысіць ураджайнасць сельгаскультур на 5—10 %.

## Гіграскапічны пакет і вентыляцыйнае вядро

У Слонімскім раёне запланаваны для закладкі восем эксперыментальных буртоў з розным утрыманнем арганічных кампанентаў. Прадугледжаны раздзельны збор трэсак і арганічнай часткі ЦКА, якая збіраецца з 500 кватэр аднаго з мікрараёнаў Слоніма, удакладніла Ірына Вага:

— Людзі збіраюць свае харчовыя адходы (лісце, зялёную траву, смецце з кухні і пілавінне) у біяраскладальныя пакеты. Наяўнасць апошніх — абавязковая ўмова, бо смецце ў іх адразу складзіруецца на пляцоўцы для кампасціравання і ўсё разам пасля перарабляецца ў кампост.

Перш чым распачаць праект, жыхарам тлумачылі яго сутнасць і прапаноўвалі спецыяльныя вёдры, пакеты і памяткі, дзе абазначана, якія адходы падыходзяць для кампасціравання. Шмат хто быў настроены скептычна, аднак знайшлося і нямала зацікаўленых, расказаў **Сяргей ПЯТЛІЦКІ, намеснік дырэктара Слонімскай ЖКГ.**

Для ўдзелу ў праграме арганічнага кампасціравання ў гаспадаркі ёсць адпаведныя машыны і механізмы. Смеццявоз, кантэйнеры для збору харчовых адходаў, якія пастаўлены на пляцоўках, варушыцель кампосту на палігоне і сіта. А непасрэдна жыхарам выдаюць спецыяльныя пакеты і невялічкага памеру адмысловыя вентыляцыйныя вёдры.

— Першапачаткова мы разлічылі, што з 500 кватэр (пры разліку пяць кілаграмаў з чалавека ў месяц) будзе збірацца 7,5 тоны адходаў у месяц. Мы зыходзілі з таго, што ў сям'і з чатырох чалавек за два дні ствараецца вядро «кухоннага» смецця. Праз больш працяглы тэрмін пакет пачне раскладацца проста на кухні. Нельга захоўваць біяраскладальны пакет з харчовымі адходамі і ў звычайным смеццевым вядры, бо ў вентыляцыйным вядры ўсё поўнасцю адкрыта, і за суткі смецце ў ім падсушваецца. Гэта, прынамсі, адбываецца і з-за таго, што пакеты гіграскапічныя — прапускаюць паветра, а не вільгаць. Калі з вечара пакласці цэлы пакет харчовага смецця, раніцай у ім адходаў будзе на 20 % меней. А ў спецыяльнай памятцы, якую таксама атрымалі ўдзельнікі праекта, сцісла і з малюнкамі апісана, што трэба збіраць.

Камунальнікі не толькі забяспечылі жыхароў адмысловымі пакетамі і вёдрамі, але і ўстанавілі на смеццевых пляцоўках спецыяльныя еўракантэйнеры з поліэтылену высокай якасці для збору і цэнтралізаванага вывазу харчовых адходаў. За месяц праграмы вывезлі 1400 тон харчовых адходаў, што не так і многа, кажуць спецыялісты, але ж пачатак пакладзены.

Рэагавалі людзі на новую прапанову па-рознаму. Хтосьці пагаджаўся адразу, хтосьці казаў, што яму проста лянота займацца асобным зборам, — цікава, што гэта гучала ў асноўным ад моладзі. А вось 30—40-гадовыя жыхары з ахвотай падключыліся да праекта. Пенсіянеры таксама далучыліся амаль усе (да 90 %).

Камунальнікі стварылі групу па харчовых адходах у «Вайберы», дзе выкладаюць матывацыйныя відэа, а жыхары, у сваю чаргу, дадаюць уласную інфармацыю, як яны спраўляюцца. Тым не менш працэс пакуль рухаецца складана (з 500 кватэр удзельнічаюць толькі 160), удакладніў намеснік дырэктара. Пры гэтым некаторыя ставяцца да збору не надта пільна і кідаюць у смецце не толькі харчовыя адходы. Таму камунальнікі плануюць вывесіць на пад'ездах дадатковую інфармацыю, чаму змешваць адходы нельга. Спецыялісты галіны абяцаюць, што, пакуль у эксперыментальных буртах саспявае кампост (тры месяцы), яны будуць ладзіць розныя цікавыя мерапрыемствы, скіраваныя найперш на дзяцей. Менавіта малыя пасля будуць падштурхоўваюць бацькоў дзейнічаць, а значыць, ёсць надзея, што больш смецця будзе перапрацоўвацца.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Надвор'е

## НАМЯЦЕ І ЗАСНЕЖЫЦЬ, А ПА ПОЎДНІ МАГЧЫМЫ НАВАТ ДОЖДЖ

**«Уплывовыя» да нас зазірнуць атмасферныя франты на гэтым тыдні. Яны прынясуць нашай краіне месцамі добрыя ападкі, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



На працягу працоўнага тыдня — ападкі ў выглядзе снегу і мокрага снегу, пры слабаадмоўных тэмпературах па захадзе і паўднёвым захадзе краіны магчымы дождж. У аўторак на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, па захадзе з дажджом. Месцамі чакаецца туман і галалёд. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Вецер паўднёва-заходні, заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўдзень будзе ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла, па ўсходзе краіны — 3—8 марозу.

Марознае надвор'е пратрымаецца і ў сераду. У гэтыя суткі ўначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі краіны, а ўдзень месцамі па паўднёвым захадзе пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Вецер заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—9 марозу, пры праясненнях — да мінус 10—13 градусаў. Удзень будзе ад нуля да мінус 6 градусаў.

Даволі кантраснае надвор'е чакаецца ў чацвер. Калі па ўсходзе краіны будзе зусім холадна, то па паўднёвым захадзе — да плюсавой тэмпературы. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе снег, мокры снег, удзень па паўднёвым захадзе магчымы дождж. У асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер паўднёвы, паўднёва-заходні ўмераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—12 марозу, па ўсходзе пры праясненнях — мінус 13—15 градусаў, па паўднёвым захадзе — 1—4 градусы ніжэй за нуль. Удзень — ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла, па ўсходзе — да 6 марозу.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу часам пройдуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, па поўдні магчымы дождж. Месцамі чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 1 цяпла, па ўсходзе — да мінус 6 градусаў. Удзень будзе ад 3 марозу да 3 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ААН назвалі пяць глабальных пагроз



Генеральны сакратар Арганізацыі Аб'яднаных нацый (ААН) Антоніу Гутэрыш, выступаючы на Генасамблеі ў Нью-Ёрку, назваў пяць асноўных пагроз, з якімі свету давядзецца змагацца ў 2022 годзе. Аб гэтым паведаміла аўстрыйскае радыё ORF. «Пандэмія каранавіруса, кліматычны крызіс, стан сусветнай фінансавай сістэмы, інтэрнэт-беззаконне, а таксама пагрозы міру і бяспецы — гэта самыя вялікія выклікі, якія стаяць перад светам цяпер», — заявіў Гутэрыш. Пазней, размаўляючы з журналістамі, ён адзначыў, што ў свеце цяпер назіраецца даволі «непрыгожая карціна». Аднак чалавецтва, паводле яго слоў, не можа дазволіць сабе раскошу проста каталагізаваць праблемы — іх неабходна вырашаць. Але зрабіць гэта можна толькі пры ўмове салідарнасці дзяржаў, падкрэсліў генеральны сакратар ААН.

### Toyota прыпыняе вытворчасць на 11 заводах

Найбуйнейшы японскі аўтавытворца Toyota абвясціў аб прыпыненні на нявызначаны тэрмін вытворчасці на 21 лініі 11 заводаў унутры краіны. Адпаведная заява апублікавана на сайце карпарацыі. У якасці прычын часовага спынення работы называецца недахоп камплектуючых, а таксама рост колькасці выпадкаў каранавіруса. У рэлізе адзначаецца, што напярэдадні стала вядома аб 20 заражаных ковідам супрацоўніках прадпрыемстваў. Прагназуецца, што перабоі ў вытворчасці паўплываюць на выпуск каля 1500 аўтамабіляў, у тым ліку папулярных мадэляў Toyota Camry. Раней японскія СМІ паведамлялі, што па выніках студзеня бягучага года агульны аб'ём вытворчасці на заводах Toyota можа быць на 47 тысяч адзінак меншы за план.

### У Турцыі здалі на металалом 500-метровы мост

У Анкары зламыснікі разабралі стары 500-метровы мост і здалі яго на металалом, паведаміла выданне Daily Sabah. Пераправа, пабудаваная ў 1936 годзе, была пашкоджана паводкай каля 40 гадоў таму. З таго часу ёй перасталі карыстацца. Некалькі тыдняў таму зламыснікі дэманціравалі мост на працягу чатырох дзён пры дапамозе спецыяльнай тэхнікі. У выніку яны атрымалі каля 70 тон металу, які паспяхова рэалізавалі за 36 тысяч долараў. Мясцовыя жыхары пры гэтым лічылі, што мост зносяць па распараджэнні ўлад. Усе, хто мае дачыненне да зносу моста, затрыманы.

На слыху

## Развод на журавінах і драўніне

### Жыхар Лельчыц падмануў шэраг грамадзян на агульную суму звыш 30 тысяч рублёў

**У снежні мінулага года ў Лельчыцкі РАУС пачалі паступаць паведамленні ад жыхароў раёна аб тым, што 30-гадовы мясцовы жыхар на падставе набыцця завалодаў сабранымі ў лесе ягадамі.**

Усе яны расказвалі, што беспрацоўны мужчына сустракаў іх каля лесу на мікрааўтобусе, які браў у знаёмага, і скупляў сабраныя ягады журавін для далейшага перапродажу буйным нарыхтоўшчыкам. Праз некаторы час, зарабіўшы пэўны аўтарытэт, ён пачаў браць ягады ў доўг, абяцаючы разлічыцца пасля перапродажу. Аднак разліку грамадзяне так і не дачакаліся. Праваахоўнікам вядома аб незаконным прысваенні звыш 830 кілаграмаў журавін на суму больш чым 5,6 тысячы рублёў.

Дарэчы, як удакладніе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гомельскага аблвыканкама, гэты ж грамадзянін аказаўся датычным да падману двух жыхароў Лельчыцкага раёна ў першай палове мінулага года. Ім ён назваўся гандляром драўнінай і паабяцаў прывезці тавар на агульную суму больш за 11 тысяч рублёў. Аднак, яго кліенты засталіся ні з чым. Акрамя таго, схему з продажам драўніны ён пракруціў у дачыненні да жыхара Лідскага раёна. Там сума ўрону складае каля 15 тысяч рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Прыкметы часу

# СЛОВЫ АД СЭРЦА

## Вернем іх у наша жыццё?

**Напэўна, большасць нашых чытачоў памятае час сапраўдных папяровых лістоў — напісаных ад рукі, з доўгімі апісаннямі паўсядзённых спраў і падзей. Сёння такія лісты пішуць рэдка, мы жывём у эпоху месенджараў. І, пагадзіцеся, калі трэба нешта напісаць ручкай на аркушы паперы, у першую секунду дзеянне здаецца нязвыклым, і руцэ даводзіцца «ўспамінаць» навык. Між тым і медыкі, і псіхолагі, і работнікі пошты аднадушныя ў тым, што рукапісныя лісты і паштоўкі варта вярнуць у нашу штодзённасць.**

У «Вайберы» мы перапісваемся з пажылымі бацькамі і настаўнікамі сваіх дзяцей-школьнікаў. У WhatsApp і Telegram маем зносіны з калегамі і атрымліваем заданні ад кіраўніцтва. У Facebook Messenger філасофствуем і дзелімся з сябрамі разважаннямі пра жыццё. І ўсё гэта — кароткімі паведамленнямі. Абыходзімся некалькімі фразамі, каб расказаць аб пачуццях і з'явах і нават прызнацца ў каханні. З кароткіх паведамленняў даведаемся аб найважнейшых падзеях ва ўласным жыцці: хваробе або вылздараўленні блізкага, рашэнні каханага стварыць з вамі сям'ю або падаць на развод, а кіраўніцтва — аб вашым павышэнні або звальненні...



Памятаеце, як спачатку папяровыя лісты змяніліся на электронныя? Потым і электронныя лісты, адносна недалёкія ад эпісталярнай «класікі», ператварыліся ў сродак у асноўным толькі рабочай камунікацыі. Месенджары прызвычаілі нас да сціслацці-«сястры таленту». А пачуцці наогул можна выказаць наборам смайлікаў. Або замяніць уласныя словы стыкерамі: «Абдымашкі!», «Люблю цябе», «Сумую»... Сродкаў і спосабаў камунікацыі стала больш, але сама камунікацыя, як ні дзіўна, стала бяднейшая. Дык ці варта «скідаць з карабля гісторыі» лісты ад рукі і папяровыя паштоўкі да свят? Раптам, зусім развучыўшыся пісаць такія пасланні, мы і сапраўдныя чалавечыя эмоцыі забудзем у скрыні камоду разам з пісчай паперай і шарыкавымі ручкамі? А замест іх у нас будуць стыкеры на ўсе выпадкі жыцця: «Нічо-сі!», «Улёт!», «Мілата»...

У мінулую суботу ў аддзяленнях УП «Белпошта» прайшоў «Дзень ручнога пісьма», прымеркаваны да аднайменнага свята (яго таксама называюць Дзень почырку). У рамках акцыі кліенты аддзяленняў паштовай сувязі маглі купіць паштоўку і адправіць яе блізкаму чалавеку, папярэдне напісаўшы некалькі слоў. Супрацоўнікі УП «Белпошта» ў гэты дзень дастаўлялі паштоўкі бясплатна ў любы пункт нашай краіны.

— У выхадных, як правіла, у аддзяленнях паштовай сувязі наплыў наведвальнікаў, — тлумачыць **начальнік Асіповіцкага ўчастка паштовай сувязі Надзея БАГАЧОВА.** — Людзі прыходзяць аплаціць камунальныя паслугі, атрымаць ці адправіць пасылку або грашовы перавод. І заадно яны змаглі ўспомніць і адчуць, як гэта прыемна — адправіць паштоўку з цёплымі словамі блізкаму чалавеку. І атрымаць такую паштоўку ад тых, хто вам дарагі. Адкрыць паштовую скрыню і ўбачыць яе — зусім не тое, што адкрыць «Вайбер» і ўбачыць электроннае паведамленне. Тут зусім іншыя эмоцыі: здзіўленне, радасць. Напрыклад, калі паштоўка ад унука бабулі...

Бо над кожным рукапісным словам мы задумваемся, адзначае спецыяліст. У той час як паведамленні ў месенджарах не патрабуюць ні ўдумлівасці, ні «душы» — іх можна пісаць, не адрываючыся ад прагляду стужкі навін.

Супрацоўнікі пошты кажуць пра тое, што апошнім часам нават папяровыя лісты пісаць сталі радзей у параўнанні з тым, як гэта было яшчэ 8—10 гадоў таму. І ўсё ж ручное пісьмо пакуль не адышло ў нябыт, яно яшчэ жыве. Хоць у асноўным у фармаце падпісанай паштоўкі.

— Паштоўкі да свят падпісвае і адпраўляе блізкім, сваякам, сябрам досыць шмат людзей і ў нашы дні. І гэта не толькі людзі старэйшага ўзросту, — кажа Надзея Багачова. — Напрыклад, школьнікі і моладзь ахвотна купляюць «валянцінкі», абменьваюцца паштоўкамі да 23 лютага і 8 Сакавіка. Я нават сказала б, што паступова падпісваць паштоўкі ад рукі становіцца модна.

З аднаго боку, тут можна казаць аб праекце «Посткросінг» — сістэме абмену паштоўкамі паміж незнаёмымі людзьмі з розных канцоў свету (на студзень 2020 года ў праекце было зарэгістравана больш за 793 150 чалавек з 207 краін. Ёсць посткросеры і ў Беларусі). З іншага — паводле міжнароднага даследавання, больш за 85 % маладых людзей ва ўзросце 20—25 гадоў сёння цэняць напісаныя ад рукі пасланні вышэй за электронныя і хацелі б часцей іх атрымліваць.

### «Пішу да вас...»

Больш маштабна акцыя «Дзень ручнога пісьма» прайшла ў рэгіёнах — там у ёй удзельнічала больш аддзяленняў паштовай сувязі. У Мінску адправіць бясплатна паштоўку родным, блізкім і сябрам можна было толькі на Галоўпаштамце, з 10 да 12 раніцы і з чатырох да шасці вечара. Сярод наведвальнікаў галоўнага будынка УП «Белпошта», якія падтрымалі акцыю, была і моладзь, але ў асноўным — людзі сярэдняга і старэйшага ўзросту.

— Адправіць СМС можа кожны, — дзеліцца Ірына Валер'еўна, што прыйшла на паштамт разам з сяброўкай. — А ты паспрабуй схадзіць на пошту, купіць канверт або паштоўку, падпісаць яе, даведацца і запоўніць адрас з індэксам... Але зараз жа ўсе занятыя! Галоўны аргумент — няма часу. «Закруціліся», як кажуць мае сыны. Не было дзесяці хвілін? Не паверу!

Пенсіянерка прыйшла ў гэты дзень на пошту, каб адправіць паштоўкі сястры ў Гомель і ўнукам у Мінск.

— Я таксама паштоўкі і лісты адпраўляю нячаста, — абараняе сучасную моладзь яе спадарожніца. — Цяпер працей стэлефанавацца. Пішу, толькі калі сапраўды хачу сказаць нейкія важныя словы, каб яны захаваліся на доўгія гады. У майго брата (ён жыве ў Брэсцкай вобласці) дзень нараджэння 28 студзеня, а тут якраз і акцыя. Хоць я і без акцыі павіншавала б яго паштоўкай.

— Захоўваю паштоўкі з дзяцінства. Мы са школьнай сяброўкай расставаліся на лета, і ўвесь час адпраўлялі адна адной лісты і паштоўкі. Памятаю, з якім нецярпеннем чакала іх ад яе! Чытаеш і перачытваеш, пішаш адказ, адпраўляеш і чакаеш зноў... Вельмі яркія эмоцыі! — успамінае яшчэ адна ўдзельніца акцыі, якая прадставілася Святланай. — Цяпер паштоўкі адпраўляю рэдка. Апошні раз — гадоў сем таму, з адпачынку: ездзіла ў В'етнам.

— Асабіста я падпісваю на вялікія святы каля 10—15 паштовак, на 8 Сакавіка прыкладна столькі ж — сяброўкам з іншых гарадоў, калегам, — распавяла яшчэ адна наведвальніца. — Не згодная, што цяпер паштоўкі адпраўляюць адно аднаму толькі пажылыя людзі. Мне да пенсіі яшчэ далёка, — усміхаецца яна. — А атрымліваць паштоўкі і адпраўляць іх вельмі люблю. У нашай сям'і заўсёды было прынята адпраўляць адно аднаму паштоўкі на святы, і гэтую традыцыю мы захавалі, хоць рэгулярна стэлефаноўваемся. У апошнія гады захапілася посткросінгам, так што атрымліваць і адпраўляць паштоўкі для мяне — спраўва звыклая.



Сёння рукапісныя лісты і паштоўкі — гэта не руціна і штодзённасць, а хутчэй раскоша, паказчык важнасці таго, каму адрасавана пасланне, кажуць супрацоўнікі РУП «Белпошта». Гэта спосаб падкрэсліць сваё добрае стаўленне да адрасата. Менавіта таму іх трэба адпраўляць. І менавіта таму яны паступова ўваходзяць у моду ў сучаснай моладзі (паштовыя работнікі адзначаюць, што не здзівяцца, калі праз пару гадоў папяровыя паштоўкі з рукапісным тэкстам на абароце стануць модным трэндам).

### Пішыце лісты

Зрэшты, пісаць ад рукі важна не толькі дзеля тых, каго мы любім. Рабіць гэта варта і дзеля саміх сябе, кажуць медыкі.

— Пісаць ад рукі, безумоўна, вельмі карысна ў любым узросце. Але асабліва гэта важна для людзей сталага ўзросту, — падкрэслівае **галоўны герантолаг Беларусі Людміла ЖЫЛЕВІЧ.** — Працэс пісьма адначасова задзейнічае многія аддзелы мозгу, а спалучэнне дробнай маторыкі рук з творчым працэсам дае найлепшы эфект уздзеяння на кагнітыўныя функцыі (памяць, інтэлект і ўвагу). Чым старэйшы чалавек, тым важней яму выходзіць за рамкі звыклых дзеянняў, пашыраць дыяпазон успрымання жыцця. Пісаць ад рукі пажылому чалавеку цяжка, асабліва пры неўралагічнай сімптаматыцы. Але гэта свайго роду «пальчыкавая гімнастыка», якая з'яўляецца дзейснай прафілактыкай дэменцыі (рэкамендуюць таксама трэніравацца пісаць левай рукой або «люстэркава», двума рукамі). Працэс пісьма таксама супакойвае, бо на паперу можна вынесці свае трывогі і страхі. І, вядома, вельмі карысна людзям старэйшага ўзросту атрымліваць рукапісныя лісты і падпісаныя паштоўкі ад блізкіх. У параўнанні з друкаваным тэкстам рукапісны ўспрымаецца больш персаніфікаваным, у ім ёсць «душэўны кампанент». А душэўнае цяпло, клопат і ўвага блізкіх неверагодна важныя для пажылых людзей — яны даюць ім сілу жыць.

| 31 | Пескоструйная установка цех № 1, инв. № 60633 | **11 000,00** | 1 100,00 |
| 32 | Осушитель воздуха CDX-9, инв. № 60976 | **1 300,00** | 130,00 |
| 33 | Токарно-винторезный станок «Монарх», инв. № 60577 | **11 450,00** | 1 145,00 |
| 34 | Барная стойка 1750-600-1100с/з, инв. № 60799 | **700,00** | 70,00 |
| 35 | Барный стеллаж 2520-450-2300с/з, инв. № 60798 | **1 350,00** | 135,00 |
| 36 | Барная стойка 1770-1090-1100/2300с/з, инв. № 60800 | **1 550,00** | 155,00 |
| 37 | Кран-балка г/п 2 тн, инв. № 50751 | **1 700,00** | 170,00 |
| 38 | Кран-балка электрическая г/п 2 тн, инв. № 50132 | **1 440,00** | 144,00 |
| 39 | Кран-балка г/п 2 тн, инв. № 50138 | **1 020,00** | 102,00 |
| 40 | Кран-балка, г/п 1 тн, инв. № 50117 | **1 020,00** | 102,00 |
| 41 | Таль электрическая, г/п 0,5 тн, инв. № 50240 | **1 020,00** | 102,00 |
| 42 | Электротельфер УП-2ТН3, инв. № 50140 | **1 440,00** | 144,00 |
| 43 | Кондуктор для изготовления панелей, инв. № 61400, ввод в эксплуатацию – 30.07.2015 | **1 200,00** | 120,00 |
| 44 | Кондуктор для сборки порталов К1034845 и боковых элементов к 1034843, инв. № 61419, ввод в эксплуатацию – 10.05.2017 | **1 650,00** | 165,00 |
| 45 | Кондуктор для сборки стрелы ЕТ 2301-10.02, инв. № 61372, ввод в эксплуатацию – 27.12.2013 | **2 700,00** | 270,00 |
| 46 | Кондуктор для сборки корпуса рукояти ЕТ 2301-10.02, инв. № 61371, ввод в эксплуатацию – 27.12.2013 | **3 000,00** | 300,00 |
| 47 | Кондуктор для обработки стрелы на станке МС21Г25, инв. № 61387, ввод в эксплуатацию – 31.07.2014 | **1 950,00** | 195,00 |
| 48 | Кондуктор для сборки дорожек, инв. № 61383 | **4 150,00** | 415,00 |
| 49 | Аппарат пылеулавливающий ЗИЛ-900 1,5/3000, инв. № 61261 | **400,00** | 40,00 |
| 50 | Станок 4К722АФ-1, инв. № 50372 | **4 200,00** | 420,00 |
| 51 | Стенд для испытаний коллектора центрального 130.00-52.00.9000, инв. № 60943 | **11 133,33** | 1 113,33 |
| 52 | Установка для грибовидности балок, инв. № 61421 | **8 750,00** | 875,00 |
| 53 | Пресс гидравлический П6332Б, инв. № 50161 | **9 700,00** | 970,00 |
| 54 | Пресс гидравлический для вулканизации 100х400, инв. № 50231 | **4 950,00** | 495,00 |

**Продавец:** открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», 247210, г. Жлобин, Гомельская область, ул. Школьная, 8.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 303-53-09, Григорович Павел Карлович.** **Шаг аукционных торгов –** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в российских рублях (RUB) – ПАО Сбербанк г. Москва, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, ИНН 7707083893, к/с 30111810800000000154, БИК BLBBBY2X, ОАО «Белинвестбанк», УНП 807000028, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 25 января 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 24 февраля 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38. Тел. + 375 29 688-04-88** |

**Предмет повторного аукциона**
Местоположение **– Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, направление ТЭЦ-4, 3-й пер. Монтажников**

**Лот № 1**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (номер дома) |
|---|---|---|---|
| **Изолированное помещение № 1** (производственное помещение) | 206,3 кв. м | 600/D-91728 | 3А-4 |
| **Изолированное помещение № 2** (административное помещение) | 221,7 кв. м | 600/D-91729 | 3А-4а |
| **Изолированное помещение № 3** (производственное помещение) | 288,4 кв. м | 600/D-91730 | 3А-4б |
| Складское помещение | 205,2 кв. м | 600/D-40243 | 3-7 |

**Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 1 524 960,00 бел. руб.** (снижена на 10 %)
**Шаг аукциона – 76 248,00 бел. руб.**

**Лот № 2**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (номер дома) |
|---|---|---|---|
| Административное помещение | 233,6 кв. м | 600/D-40239 | 3-5 |
| Административное помещение | 83,9 кв. м | 600/D-40241 | 3-6 |

**Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 627 480,00,00 бел. руб.** (снижена на 10 %)
**Шаг аукциона – 31 374,00 бел. руб.**

Обременение: площади помещений частично сданы в аренду (с информацией можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

**Порядок ознакомления:** в рабочие дня по предварительному согласованию, тел. +375 (29) 680-80-99 (Шубко Юлия Владимировна)

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации на аукцион одного участника, предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа: ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить организатору аукциона вознаграждение 3 % от цены продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 04.01.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **10.02.2022 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |
| **Дата и время начала и окончания приема заявлений** | **С 09.00 25.01.2022 до 17.00 08.02.2022** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка» |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@ipmconsult.by**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Предмет торгов – Лот: капитальное строение с инвентарным номером 100/С-59564 (наименование: ПЕРЕХОДНАЯ ГАЛЕРЕЯ МЕЖДУ КОРПУСАМИ № 1 и № 2;** назначение: здание административно-хозяйственное) площадью 1642,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Московская, д. 202, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001033293 площадью 0,1208 га

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | 296 000,00 | **Размер задатка, руб.** | 29 600,00 |

**Продавец:** ОАО «Брестский электромеханический завод», г. Брест, ул. Московская, 202, тел./факс 80162321933. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона, в течение 3 рабочих дня со дня аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 01 марта 2022 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 28 февраля 2022 г. до 17.00**

Уладзіслава АРЦЮКОЎСКАЯ:

# «СМЕЛАСЦЬ У ТВОРЧАСЦІ — СЁННЯШНІ ТРЭНД»

**На Нацыянальнай тэатральнай прэміі мюзікл-дэтэктыў «Джэк Патрашыцель» Маладзёжнага тэатра эстрады быў прызнаны найлепшым у секцыі «Музычны тэатр». Прыклад, калі поспех пачынаецца з асобных людзей, аб'яднаных агульнай мэтай і жаданнем выніку. І роля мастацкага кіраўніка калектыву Уладзіславы Арцюкоўскай у гэтым адметная. Як яна сама прызнаецца, магла б быць палкаводцам, распрацоўваць стратэгічныя планы і змагацца да апошняга патрона, але... Замест гэтага піша сцэнарыі, ставіць спектаклі і кіруе ўсімі творчымі працэсамі. І шчыра верыць, што змяніць свет можа кожны па меры сваіх магчымасцяў, характару і любові...**

***— Уладзіслава Ігараўна, з вашым прыходам у тэатр жанр мюзікла пачаў тут развівацца ў розных напрамках... Тры гады таму вы агучвалі жаданне працаваць плённа, і сёння ўжо можна падводзіць пэўныя прамежкавыя вынікі зробленага.***

— Стабільна дванаццаць прэм'ер на год — такога, магчыма, больш нідзе і не сустрэнеш. І ў мяне часта пытаюць, адкуль столькі творчай энергіі? А ў нас проста кожны займаецца сваім напрамкам: адны робяць канцэртныя праграмы, іншыя — пастаноўкі. Мы ладзім канцэрты ў Палацы Рэспублікі з тэлевізійнымі трансляцыямі і тым самым папулярызуем нашых артыстаў — у Беларусі часта сваіх проста не ведаюць. Многія планы парушыла пандэмія, нешта даводзілася мяняць, аднак мы не спыніліся. Проста даводзіцца прыстасоўвацца да жыцця. Як эксперымент, нават рабілі канцэрт у батанічным садзе, што дазволіла сабраць аўдыторыю на свежым паветры.

***— Тэатральнаму мастацтву ў адрозненне ад, скажам, кіно больш складана адаптавацца ў новых рэаліях, бо нават тыя ж інтэрнэт-пляцоўкі — гэта не раўнацэнная замена сцэне, і там успрыманне не тое...***

— Згодная, тэатр не павінен быць анлайн, бо тэатр — гэта магія, таямніца, жывая энергія. Калі не ўдалося данесці аўдыторыі свой пасыл, то яна і не атрымае катарсіс. Калі глядач выходзіць са спектакля, то ён павінен быць напоўнены энергіяй. І для артыстаў кожная сустрэча з гледачамі з'яўляецца тым самым абменам энергіямі і магіяй, якія напаўняюць усіх.

***— Якія тэндэнцыі ўласцівыя сучаснаму мюзіклу і дзе мы, беларусы, у гэтым кантэксце?***

— Сучасныя гледачы вельмі распешчаныя. Нават дзіця цяжка нечым здзівіць пасля тых магчымасцяў, якія дае яму тэлефон. Я, напрыклад, памятаю, наколькі была пад уражаннем, калі ў дзяцінстве глядзела ў ТЮГу «Міколку-паравоза». Сучасным дзецям ужо цяжка ўспрымаць гэтую гісторыю, бо яны бачаць пэўны прымітывізм, і ўсё ім здаецца несапраўдным. Але ж тэатр — гэта пэўная ўмоўнасць. І музыка з'яўляецца той самай вібрацыяй, якая стварае непаўторную атмасферу і ўздзейнічае на аўдыторыю. Таму мне і падабаецца жанр мюзікла, бо ён аб'ядноўвае тэатральнае і музычнае мастацтва. У нас сабраліся выдатныя вакалісты, адметная сугучнасць галасоў. Мы маем магчымасць сіламі такіх людзей рабіць неверагодныя рэчы. І, думаю, за гэтым будучыня. Я разумею, што, напрыклад, такі жанр, як мюзікл-прытча — «Ты і я», яшчэ і на беларускай мове — складаны для ўспрымання. Мне нават у працэсе падрыхтоўкі казалі, што я адчайна смелая, бо звычайна калі беларуская тэма падымаецца, то гэта лапці, вёска і гэтак далей, а ў нас там багі, волаты, філасофія плюс мова, якую не ўсе дастаткова добра разумеюць. Але калі ўсё так, то значыць, праблема ў нас саміх, што не маем павагі да роднага слова... Альбо іншы прыклад — мюзікл-дэтэктыў «Джэк Патрашыцель», гісторыя, у якой гледачам яшчэ трэба разабрацца, хто вінаваты, а хто не. Кожны раз, калі я бяруся за новыя тэмы, калегі кажуць, што я рызыкую. Але, па маіх назіраннях, смеласць у творчасці — гэта сённяшні трэнд. Рызыкаваць варта, толькі мы, беларусы, вельмі баімся тое рабіць.

***— Чым вы можаце растлумачыць гэтыя боязь і няўменне любіць сваё?***

— Няўменне любіць — самае страшнае для беларусаў. І я не спісваю гэта на ментальнасць ці гісторыю. На мой погляд, прычына — адсутнасць выхавання, што бярэ пачатак у дзяцінстве. У нас на падкорцы адкладваецца паўсюднае бурчанне, маўляў, усё ў нас дрэннае і мы такія ж. А глядзіш на людзей — і ўсе яны не дурні. Мая мама лічыла, што меланхалічнасць у нас — ад адсутнасці сонца, а як вынік, гэта адбіваецца на ўспрыманні навакольнага свету. Нам не хапае аптымізму. Калі, пачынаючы з сям'і, будзе прывівацца пачуццё любові да сябе, усіх, хто побач, то можна спадзявацца на змены. А мы ж часта нават не ведаем імёнаў сваіх суседзяў, не кажучы пра тое, каб запрасіць іх на гарбату. Мы надоечы пачалі работу над новай тэмай, дзе прысутнічае рэлігія, і ў працэсе выявілася, што сярод супрацоўнікаў у нас ёсць глыбока веруючыя людзі. І, уявіце сабе, яны гатовыя працаваць пакуль нават без аплаты, настолькі ім важная рэалізацыя ідэі. Я перакананая, што ўсе мы маем патрэбу ў духоўным. Галоўнае толькі, каб знайшліся тыя, хто падкажа шлях і пакліча за сабой. Пачаць варта з малога, з саміх сябе. Навучыцца хваліць уласных дзяцей, ганарыцца тым, што робіць і стварае кожны з нас. А атрымліваецца, што часцей чуеш крытыку... У той жа Маскве кожны тэатр і артыст заўсёды скажуць вам, што яны самыя лепшыя, хоць, вядома, выходзяць пастаноўкі рознага ўзроўню, без гэтага ў творчасці ніяк. Аднак там будуць пераконваць, што іх работа выдатная. Вось да чаго трэба імкнуцца — да ўмення любіць сваё і радавацца за іншых.

***— Мяне прыемна здзівіла і парадавала, што на вашым сайце размешчаны кантакты розных службаў дапамогі тым, хто знаходзіцца ў сітуацыі нейкай залежнасці ці падвяргаецца гвалту... Чыя гэта ідэя і ці спрацоўвае яна?***

— Я перакананая, што такая інфармацыя павінна быць на любых сайтах. Ніколі не ведаеш, дзе і ў які момант чалавек знойдзе яе, і, можа, менавіта гэта і падштурхне да дзеяння. Псіхалагічныя праблемы заўсёды вельмі складаныя, і здараецца, што часам людзям не так цяжка вылечыцца, як зрабіць крок насустрач такому рашэнню. Тут павінна быць узаемная павага.

Мы і тэатр будуем па гэтым прынцыпе. Калі я толькі прыйшла сюды працаваць, то не ўсе былі настроеныя добразычліва. Але мы сталі размаўляць. Бывала, па гадзіне з кожным гаварылі. Я не шкадавала энергіі і часу, таму што разумела: людзям гэта патрэбна. Многія праблемы мы здолелі б вырашыць, калі б навучыліся размаўляць і чуць адно аднаго.

***— А дзе вы бераце рэсурс, каб аднаўляць энергію, якую трацiце на работу з калектывам і творчы працэс?***

— Проста не варта скупіцца на энергію, калі мы такім чынам можам дапамагчы іншым. У гэтым жа і сутнасць існавання чалавека. Любая творчасць у калектыве дае магчымасць раскрыць людзей, іх здольнасці. Калі гэта атрымліваецца, то ў чалавеку раскрываюцца новыя рэзервы, ён адчувае, што можа лётаць. Таксама і гледачы, калі прыйдуць у наш тэатр і за праглядам спектакля вырвуцца са сваёй штодзённасці, то гэта сведчанне таму, што робім усё недарэмна. Я ў складзе рэжысёрска-пастановачнай групы фестывалю «Вытокі» праехалася па беларускіх гарадах і ўбачыла, як жывуць людзі. У іх ёсць работа, сям'я, але няма захапленняў. А без гэтага чалавек не атрымлівае натхнення. І калі людзі прыходзілі на нашы акцыі, я бачыла шчаслівыя твары. Ім тое патрэбна.



## Бліц-апытанне:

**1. Любая форс-мажорная сітуацыя для мяне...** — Гэта цікавае выпрабаванне.

**2. Творчасць губіць...** — Абыякавасць.

**3. Тры эпізоды вашай біяграфіі, якія маглі б стаць асновай добрага сцэнарыя...** — Мае дзіцячыя прыгоды, якія былі вельмі вясёлымі. Абавязкова нешта пра першае каханне. І хацелася б яшчэ напісаць пра штосьці, чаго са мной яшчэ не здаралася.

**4. Назавіце фільм, які вы гатовыя глядзець у любым настроі** — Я вельмі люблю «Гары Потэра». Цуды і выдуманы свет мяне вельмі захапляюць. Творчасць Джаан Роўлінг і тое, як яна прыдумала гэты твор, для мяне — той узровень, да якога я сама імкнуся.

**5. Што вы думаеце пра сучасных жанчын?** — Яны зашмат клапоцяцца пра сваё аблічча. Я згодная з тым, што трэба сачыць за вонкавым выглядам, але варта думаць і пра духоўнае.



***— Калі едзеце з гастролямі ў іншыя гарады, як сустракаюць?***

— Часам людзі думаюць, што да іх прыехалі з Масквы. Чамусьці многія думаюць, што няма ў Беларусі добрых артыстаў, а толькі прыезджыя. У нас, напрыклад, працуе акцёр Руслан Чарнецкі, якога ведаюць па расійскіх серыялах, і таму перакананыя, што артыст не беларускі. Нашы прыезды даюць людзям наглядны прыклад, якіх выдатных артыстаў мы маем. Цікава было б паехаць з гастролямі па Расіі і паглядзець, як там нас будуць прымаць.

***— Раней вы працавалі ў іншых тэатрах і нават абласцях. Прыход у Маладзёжны тэатр эстрады — важны крок у вашай кар'еры?***

— Я па адукацыі драматычны рэжысёр, але не скажу, што гарэла жаданнем ісці сюды. Мяне выклікаў да сябе міністр культуры (ім тады быў Юрый Паўлавіч Бондар) і прапанаваў гэтую пасаду. Я ўзяла час на роздум, бо не люблю непрафесіяналізму, вельмі педантычная ва ўсім, і таму не разумела, ці змагу справіцца з пастаўленай задачай, выбудаваць адносіны. Тут вырашальную ролю адыграў мой муж. Ён сказаў, што трэба пагаджацца, бо інакш нічога нідзе так і не зменіцца, калі ўсе толькі і будзем сумнявацца і чакаць. Спачатку сапраўды было вельмі складана. Нехта не пажадаў працаваць са мной і сышоў, а на змену ім прыйшлі маладыя артысты-энтузіясты.

***— Якіх прынцыпаў вы прытрымліваецеся як мастацкі кіраўнік тэатра?***

— Я па жыцці не люблю здраднікаў і заўсёды давяраю людзям. Не люблю, калі ў вочы мне кажуць адно, а за спінай зусім іншае. Як для мяне, то лепш адразу скажы, што ненавідзіш. У мяне быў выпадак, калі мне адна калега так і сказала: я цярпець вас не магла, а потым прыгледзелася і зразумела, якая вы працавітая. Мы ж робім адну агульную справу. Не трэба крывадушнічаць, будзьце шчырымі.

***— Яшчэ ў школе спектакль па вашай п'есе «Пакуль зоркі не згаслі» быў адзначаны ўзнагародай. Потым ва ўніверсітэце заўважылі вашу пастаноўку TUTTI FRUTTI. То-бок з самага пачатку вашага прафесійнага шляху жыццё з адабрэннем прымала вашу творчасць. Цяпер за плячыма вялікая колькасць пастановак, узнагарод, ці не даводзілася хварэць на зорную хваробу?***

— Я заўсёды імкнуся глядзець на сябе збоку, паколькі ведаю, што зорная хвароба можа паглынуць любога і вельмі хутка. Таму час ад часу пытаюся ў сябе: ці не загулялася я? І пастаянна кудысьці бягу, нешта сабе прыдумваю. Прычым я такая з дзяцінства. Мне заўсёды патрэбен рух, новыя спробы.

***— Вашы дзеці таксама цягнуцца да творчасці?***

— Так, мае дзяўчаткі ўсе знайшлі сябе ў творчасці, а я думаю, чаму яны не хімікі ці матэматыкі? Бо творчая прафесія — гэта складаны шлях, дзе цябе ўвесь час б'юць, а трэба ўставаць і ісці далей. Неяк глядзела, як Сільвестр Сталонэ распавядаў пра свае спробы прабіцца. Сем гадоў пісаў сцэнарыі, і яму паўсюль адмаўлялі. Дабіўся ўсё ж свайго, але не кожны здольны столькі часу змагацца безвынікова. Нават першая няўдалая спроба можа зламаць чалавека, і ён сыходзіць у іншую прафесію. Таму тут трэба мець вялікую сілу.

***— Якія рысы вашых персанажаў вам найбольш блізкія?***

— Мне падабаюцца мужныя героі. У кожнага з іх вучуся дастойна прымаць любыя выпрабаванні лёсу. Эмоцыі ніколі не дапамагаюць. Хоць я вельмі эмацыянальны і сентыментальны чалавек, але ўсё залежыць ад кантэксту сітуацыі. Магу пачуць кранальную гісторыю і заплакаць — і тады гэта будуць слёзы ачышчэння. А ў астатнім дысцыплінаю сябе, бо лічу, што кожны дзень — гэта барацьба і выпрабаванне, дзе трэба ўмець выстаяць.

***— На вашу думку, ці можна сёння пралічыць поспех пастаноўкі, калі рабіць стаўкі на рэжысёра, склад артыстаў і г. д.?***

— Як драматург я ведаю заўсёды, якія моманты могуць «стрэліць». Але творчасць — як вера, яна проста павінна быць. І самае галоўнае, каб сэрца спявала. А калі толькі галавой пралічваеш, то нічога не атрымаецца.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з архіва гераіні.**

Захавальнікі традыцыі

# БЕЛАСНЕЖНЫЯ МАРЫ

## Чаму на Навагрудчыне выцінанку называюць выбіванкай

**СЁННЯ ўжо нікога не здзівіш выцінанкамі. Штогод напярэдадні навагодніх свят па ўсёй Беларусі людзі старанна выразаюць бялюткія сняжынкі, анёлкаў і ялінкі. Намаляванымі выцінанкамі аздабляюць кнігі, іх выкарыстоўваюць пры стварэнні анімацыі і афармленні спектакляў. І хоць выраб з паперы ўзораў і сілуэтаў вядомы яшчэ з часоў Леанарда да Вінчы, асаблівую папулярнасць на нашых землях выцінанка займела на мяжы XIX і XX стагоддзяў.**

Сяляне бачылі ў панскіх дамах прыгожыя сурвэткі, абрусы, фіранкі. Дарагія ажурныя тканіны маглі сабе дазволіць не ўсе. Папера стала выдатнай альтэрнатывай. Пад рукой таленавітых майстрых узнікалі далікатныя кветкі, птушачкі, арнаменты... У розных кутках Беларусі людзі шукалі свае падыходы да стварэння такой прыгажосці. На Навагрудчыне папяровых спраў майстры ўзброіваліся... малатком. Тут рабілі асаблівыя ўзоры, якія размяшчаліся на ромбападобнай сетцы, што імітавала гардзінное палатно. Нажніцамі падобныя роўныя ромбікі не зробіш, але дзякуючы народнай кемлівасці выйсце было знойдзена: са складзенай у некалькі пластоў паперы іх можна выбіць. Таму і завуць тут выцінанку выбіванкай.

Яшчэ ў пасляваенныя гады бялюткімі папяровымі ўпрыгажэннямі ў вёсках пад Навагрудкам і Карэлічамі аздаблялі хаты — іх размяшчалі на вокнах, сталах, куфрах, паліцах, клалі на іх велікодныя булкі, рабілі набожнікі. Папяровымі ўзорамі аздабляліся і храмы. Перад Вялікаднем па вёсках нават прадавалі выкананыя ў гэтай тэхніцы сурвэткі пад пірагі і «дэкор» для хаты.

Праўда, век у такіх мастацкіх вырабаў быў кароткі. Штогод да свят выразаліся новыя ўпрыгажэнні, а старыя ніхто не захоўваў. З цягам часу, калі магазінныя рэчы пачалі выцясняць самаробныя, выцінанкі на вокнах змянілі цюль і шторы. Пра старую традыцыю і незвычайныя тэхнікі маглі б забыцца, каб не энтузіясты, якія вырашылі не проста аднавіць выбіванку, але і даць ёй шанц на новае жыццё. У 2014 годзе навагрудская традыцыйная выцінанка-выбіванка займела статус гісторыка-культурнай каштоўнасці





Рэспублікі Беларусь як элемент культурнай спадчыны.

Пра выбіванку згадалі і падчас уручэння штогадовых прэмій «За духоўнае адраджэнне». **Кіраўнік народнага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь клуба майстроў народнай творчасці «Каляровая альтанка» Навагрудскага раённага цэнтра рамёстваў Наталля КЛІМКО** сёлета адзначана спецпрэміяй Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва за плённую работу па захаванні традыцый вырабу беларускай выцінанкі.

Наталля Клімко — народны майстар Беларусі, член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці — стварае мастацкія рэчы і шчыра дзеліцца сакрэтамі вырабу папяровых цудаў. На якіх толькі святах, фестывалях і конкурсах не пабывала навагрудская выбіванка!

Сёння яна вядомая ўжо і за межамі Беларусі. Заморскія госці ў цэнтры рамёстваў знаёмяцца з мясцовымі папяровымі тэхнікамі, і вырабы, зробленыя сваімі рукамі, вязуць на радзіму. Як «данеслі» мясцовым майстрам, недзе ў Швецыі ўжо свецяць ліхтар, аздоблены беларускай выбіванкай.

Сваім другім нараджэннем выбіванка абавязана ўраджэнцы вёскі Мілушава Навагрудскага раёна Ніне Шурак. Жанчына, рыхтуючы экспазіцыю гісторыка-краязнаўчага музея, вырашыла стварыць куточак вясковай хаты, і тут ужо ўспомніла пра старыя ўпрыгажэнні, якія рабіла яе маці. Яшчэ ў 1930—1950-х гадах мясцовыя жыхары пераносілі на паперу свае мары аб прыгожым спакойным жыцці — на фіранках і сурвэтках расцвіталі кветкі, з'яўляліся букеты, галубы, вяночкі. Каб выбіць складаныя ўзоры, у пасляваенныя гады ў народных майстроў у ход ішлі долата, расплюшчаныя цвікі, часам нават пустыя гільзы з-пад патронаў. Ніна Пятроўна паспрабавала аднавіць традыцыю — і вельмі хутка знайшла паслядоўнікаў. Калі жанчыны не стала, яе справу працягнуў цэнтр рамёстваў.

Навагрудскую выбіванку заказвалі вучоныя, набывалі калекцыянеры. Пра яе распавядаюць настаўнікі ў школах, на Вялікдзень папяровыя ўпрыгажэнні можна ўбачыць у храмах.

Экскурсіі, майстар-класы, заняткі для малых і пажылых, выезды ў дзіцячыя летнікі з расповедам пра мясцовыя традыцыі спрыяюць захаванню папяровага майстэрства. Дзеці ў такой тэхніцы робяць святочныя паштоўкі. Дарослыя майстры прыдумляюць, як элементы выбіванкі можна выкарыстаць у разнастайных праектах. Педагог дадатковай адукацыі Вольга Чубрык з дзяўчаткамі ў гуртку папяровай пластыкі стварылі калекцыю галаўных убораў у гэтым стылі.

Можна падумаць, як узоры выбіванкі перанесці на тканіну — такія прынты выдатна будуць выглядаць на адзенні і на сумках, а таксама на посудзе, на школьных сшытках.

Чаму б не аздобіць аграсядзібы і кавярні выбіванкай? Тым больш што яна мае ўсе шанцы на тое, каб стаць адным з брэндаў раёна.

Вернутыя імёны

# НАШ ПЕРШЫ ЛІНГВАГЕОГРАФ



**Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры» НАН праводзіць шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных 100-годдзю Інстытута беларускай культуры: круглыя сталы, прэзентацыі, сустрэчы вучоных са студэнтамі. Запрацаваў YouTube-канал, дзе будуць размяшчацца запісы мерапрыемстваў, якія праходзяць ва ўстанове, плануецца, што туды будуць выкладвацца дакументальныя фільмы, відэазамалёўкі з дыялекталагічных экспедыцый ды іншыя сюжэты. Такія захады не проста спрыяюць папулярызацыі навукі. Яны знаёмяць з нашай культурнай спадчынай, паказваюць, як шмат было зроблена беларускімі даследчыкамі. Нам сапраўды ёсць чым і кім ганарыцца. Так, адзін з круглых сталоў, што прайшоў у Інстытуце мовазнаўства, быў прысвечаны выдатнаму лінгвісту Пятру Бузуку і набыткам нацыянальнай лінгвагеаграфіі.**

Інстытут беларускай культуры аб'ядноўваў людзей, якія адкрывалі ўсяму свету беларускую мову, гісторыю і культуру. У 1929 годзе на яго базе была заснавана Акадэмія навук. Падымаць айчынную навуку вучоным даводзілася ў вельмі складаных умовах. Многія даследчыкі, якія працавалі ў Інстытуце беларускай культуры ў 1920—1930-я гады, былі арыштаваныя. Вяртанне іх работ і іх імёнаў ішло марудна, цяжка. Толькі ў 1980—1990-я гады гэтыя даследчыкі зноў апынуліся ў коле нацыянальнай эліты. Сярод навукоўцаў, пра якіх трэба згадваць і чыю спадчыну вывучаць, і Пётр Апанасавіч Бузук.

Таленавіты вучоны прыбыў у Беларусь па запрашэнні прафесара Уладзіміра Пічэты выкладаць у Белдзяржуніверсітэце. Хоць, магчыма, на яго прыезд паўплывалі і Сцяпан Некрашэвіч, і Яўхім Карскі, ва ўсякім разе іх перапіска сведчыць, што яны ўскладалі вялікія надзеі на прыезд Пятра Бузука, спадзяваліся, што гэта паспрыяе развіццю беларускага мовазнаўства. І менавіта мінскі перыяд у навуковай кар'еры Пятра Апанасавіча быў самым плённым. З 1925 да 1933 года ён паспеў напісаць больш за 50 навуковых даследаванняў. Глыбокі вучоны-тэарэтык, ён стаў нястомным барацьбітом за нацыянальную культуру і мову беларусаў.

Гэты вучоны-паліглот увайшоў у гісторыю не толькі беларускага мовазнаўства, але і наогул славянскай навукі і культуры. На першым з'ездзе славістаў, які адбыўся ў Празе ў 1929 годзе, Пётр Апанасавіч выступіў з дакладам, які адкрыў новы напрамак у славянскім мовазнаўстве. Ён стаў пачынальнікам лінгвагеаграфічных даследаванняў у славістыцы, з'яўляўся адным з самых вядомых лінгвістаў пачатку XX стагоддзя. Такімі даследчыкамі маглі ганарыцца найбуйнейшыя цэнтры славістыкі.

Бузук быў адным з тых вучоных, якія сто гадоў таму стваралі беларускае мовазнаўства, пачынальнікам многіх новых напрамкаў у навуцы. Кола яго інтарэсаў было вельмі шырокім. Ён стаў першым лінгвагеографам — у 1928 годзе выдаў атлас «Спроба лінгвістычнай геаграфіі Беларусі». Разам з Некрашэвічам займаўся складаннем праграмы, па якой збіраліся асаблівасці беларускіх гаворак. Вырашаў пытанні, звязаныя з рэформай правапісу. Пётр Бузук адным з першых звярнуў увагу на такі кірунак даследаванняў як вывучэнне мовы пісьменнікаў і паэтаў. Ёсць у яго працы, прысвечаныя аналізу моўных асаблівасцяў твораў Цішкі Гартнага, стылю маладнякоўцаў. Дарэчы, ён быў сябрам літаратурнага аб'яднання «Маладняк», пісаў вершы і апавяданні.

У Інстытуце беларускай культуры Бузук быў старшынёй Фальклорна-дыялекталагічнай, пасля Дыялекталагічнай камісіі. У 1929 годзе ён становіцца вучоным сакратаром Інстытута мовазнаўства, а ў 1931—1933 гадах — яго дырэктарам. І раптам у біяграфіі з'яўляецца запіс, што ён з'яўляецца проста навуковым супрацоўнікам інстытута. Гэта звязана з рэпрэсіямі, пра якія праходзілі вучоныя. Не пазбег арыштаў і Бузук. Пра тое, з якімі драматычнымі абставінамі сутыкаліся мовазнаўцы, сведчаць як іх біяграфіі, так і работы. Калі ў 1920-х гадах кіпелі дыскусіі, напрыклад, вакол правапісу, то ў 1930-х ужо няма такой актыўнасці, вучоныя асцерагаліся выказвацца персанальна, некаторыя работы выходзілі за подпісам «Інстытут мовазнаўства». Калі ў першыя пяць гадоў у Мінску ў Бузука выйшлі дзясяткі навуковых артыкулаў, то за 1931—1933 гады вядомыя толькі шэсць. І яму даводзілася працягваць навуковую работу ў найскладанейшых умовах, калі вялікая колькасць калег была арыштаваная, ён адчуваў, што і па яго ў любы момант могуць прыйсці. А ў вучонага было чацвёра малых дзетак...

У 1934 годзе Бузук быў арыштаваны і высланы ў Волагду, дзе спачатку працаваў бібліятэкарам, а пасля выкладаў у педінстытуце. Але пасля чарговага арышту ў 1937 годзе вучоны быў расстраляны. Цалкам рэабілітаваны толькі ў 1987 годзе.

Няпроста складвалася і жыццё сям'і Бузука. Пасля арышту вучонага яго жонку і дзяцей пазбавілі кватэры. Жанчыне на дапамогу прыйшлі яе сёстры, якія працавалі актрысамі першага беларускага тэатра. Пра гэта згадала ўнучка даследчыка Кацярына Шашыйташвілі. Бабуля распавядала ёй, што Пётр Апанасавіч быў вельмі мяккім, інтэлігентным, ніколі ад яго яна не пачула грубага, рэзкага слова. Ён меў вельмі добры голас. І як бы ён ні стамляўся, колькі б у яго ні было спраў, пасля работы завітваў да дзяцей. Яны ішлі ў парк, і па дарозе ён спяваў малым арыі на італьянскай, нямецкай мовах. На сямейных вечарах яны складалі бурымэ, лічылі літары ў вялікіх словах. І хоць дзеці Бузука выраслі таленавітымі, добра валодалі замежнымі мовамі, ім пры паступленні ў ВНУ адмаўлялі як нашчадкам «ворага народа».

Як заўважыла падчас круглага стала загадчык аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі Інстытута мовазнаўства Вераніка Курцова, захавалася багатая навуковая спадчына гэтага таленавітага вучонага — і яна заслугоўвае таго, каб быць надрукаванай асобным выданнем.

Часам архівы падкідваюць цікавыя знаходкі. Так, малады даследчык Зміцер Крымоўскі, які цікавіцца гісторыяй мовазнаўства, шукае матэрыялы, звязаныя з вучонымі XIX—XX стагоддзяў, выпадкова натрапіў на рэцэнзію Бузука на Расійска-беларускі слоўнік, падрыхтаваны М. Байковым і С. Некрашэвічам. Ён упэўнены, што яшчэ не адназначна пакаленню даследчыкаў хопіць работы ў архівах. Неабходна вяртаць памяць пра выдатных асоб, пераасэнсоўваць, вывучаць іх спадчыну, унёсак у айчынную навуку і культуру.

У хуткім часе з працамі вучоных Інбелкульта можна будзе азнаёміцца ў інтэрнэце. Супрацоўнікі Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі ўжо перавялі многія з іх у лічбавы фармат. Гэты віртуальны праект запрацуе на сайце бібліятэкі. Таксама ўстанова падрыхтавала вялікую выставу з нагоды стагадовага юбілею па выданнях Інбелкульта.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Пісьменніцкія вандроўкі

# Рэха Буднага, цень Магдалены і музей трактароў

**Сюды мы наведваліся і раней, колькі гадоў таму... Яшчэ да эпохі інтэрнэту і навігатараў. Звярнулі з сябрамі з шашы, убачыўшы знак з гучным для беларускай гісторыі назовам «Кухцічы». Але ішоў дождж, дарога ў лужынах-калюжынах, гістарычных аб'ектаў праз смугу не назіралася — і мы павярнулі назад.**

**Цяпер зразумела, што шукаць трэба было не Кухцічы, а Першамайскае. Менавіта так сёння называецца мясціна, дзе была сядзіба старажытнага роду Завішаў, казаў аўтар першага падручніка на беларускай мове Сымон Будны, куды прыязджалі дзеячы беларускага адраджэння да мецэнаткі Магдалены Радзівіл...**

## Храм абарончага тыпу

Мы, нягледзячы на наяўнасць навігатараў, і цяпер усё-ткі трошкі паблукалі, і вось бачым першы аб'ект... Музей трактарнай тэхнікі. Адкрыты ў 2020-м да 80-годдзя сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Напэўна, пастараўся Уздзенскі сельскагаспадарчы вытворчы ліцэй, які сёння займае тэрыторыю былой сядзібы. «Жалезныя коні», што дзівілі нашых дзядульбабуль, урачыста пастаўленыя на каменныя п'едэсталы, каля кожнага — шыльдачка... Трактары, вядома, дзіўна глядзяцца на фоне старасвецкіх будынкаў з калонамі... Але ўсё дагледжана, а дадатковая цікавінка для прыцягнення турыстаў ніколі не лішняя.





А мы пачынаем наш агляд з самага старажытнага тут будынка... Які пераносіць нас ажно ў XVI стагоддзе, залатое стагоддзе Вялікага Княства Літоўскага. Калі, згодна з запісам ад 1 верасня 1567 г. «Попісу войска Літоўскага», уладальнікам маёнтка Кухцічы з'яўляўся намеснік князёў Радзівілаў Мацей Кавячынскі, які набыў Кухцічы ў пана Яна Глябовіча.

Род Кавячынскіх знакаміты, хоць незаслужана забыты. Кавячынскія герба «Астоя» згадваюцца ў летапісах яшчэ ў XIV ст. Уладальнік Кухціч і саўладальнік мястэчка Узда Мацей Кавячынскі скончыў Вітэнбергскі ўніверсітэт у Германіі, дзе далучыўся да кальвінізму. Адным з кірункаў пратэстанцкага руху было асветніцтва, забеспячэнне народаў Святым Пісанем на нацыянальных мовах. У 1561—1562 гг. Кавячынскі разам з Сымонам Будным і шляхціцам Лаўрэнціем Крышкоўскім заснаваў друкарню ў Нясвіжы, карыстаючыся падтрымкай вядомага рэфарматара Мікалая Радзівіла Чорнага. Сярод кніг, выпушчаных там, былі выданні на старабеларускай мове, у тым ліку знакаміты Катэхізіс Сымона Буднага.

Пасля таго як спадкаемец Чорнага, Радзівіл Сіротка, перайшоў у каталіцтва, друкарню пратэстантаў у Нясвіжы закрыў, яе перанеслі — і, магчыма, менавіта сюды, у Кухцічы.

Тут жа, у Кухцічах, Мацей Кавячынскі будуе храм — кальвініцкі збор... Праўда, ёсць версія, што з'явіўся ён раней, пры Глябовічах, якія таксама сталі пратэстантамі. Але дакладна вядома адно — пры Мацеі Кавячынскім гэты прысадзісты храм так званага абарончага тыпу дзейнічаў, і тут прамаўляў Сымон Будны.

Падыходзім да суровага будынка, узведзенага ў часы Рэнесансу. Магутныя сцены, з-пад тынкоўкі выглядае чырвоная кроў цэглы. Колішняга купала няма, але хоць бы дах увогуле ёсць, хай сабе руберойдны. Храм мае складаную дванаццацігранную форму — так званы кафалікон, сімвал гармоніі Сусвету.

Паглядзець, што ўнутры, нельга... Усё шчыльна зачынена, вокны пазабіваныя дошкамі. З аднаго боку, нам як вандроўнікам крыўдна — нельга зайсці і ўявіць казань Сымона Буднага. Магчыма, казаў ён тут нешта і пра карыстанне роднай мовай, як у прадмове да Катэхізіса — «Абы вашы княжацкія міласці не толькі ў чужаземскіх языцэх кахалі, але бы ся теж... і того здавна славного языка славенскага размілаваці і оным ся бавіці рачылі». З другога боку, радасна — спадчына захоўваецца, няхай пакуль у стане кансервацыі, але накрытая дахам, абароненая ад вандалаў, і ёсць шанц, што старажытны храм дачакаецца рэканструкцыі.

Так, гэта дзіва, што храм добра захаваўся... Бо калі ў 1938 годзе тут была арганізавана МТС «Пагранічнік», у будынку абсталявалі падстанцыю, рухавік якой працаваў на мазуце. Тады шмат што змянілі, прыбралі гонтавы дах і пакрыты бляхаю купал, пазбівалі ляпніну...

Зрэшты, Кухціцкаму збору не прывыкаць да перабудоў. Як многія беларускія храмы, ён пераходзіў з канфесіі ў канфесію. У XVII стагоддзі пры Крыштафе Кавячынскім, падкаморыі менскім, стаў каталіцкай капліцай... У тым жа стагоддзі храм перабудоўваў італьянскі архітэктар Карла Спампані ў стылі класіцызму. З'явіліся прытвор з вежамі, ляпныя гірлянды, пілястры, над уваходам геральдычны картуш, склеп-пахавальня пад алтарнай часткай.

Але абліча будынка засталося беларускім — суровы вой, які гатовы да выпрабаванняў і доўгай абароны супраць чужынцаў і ўласных няўдзячных дзяцей...

На адной са сцен храма чорная каменная шыльда: «Тут займеў апошняе заспакаенне сын зямлі беларускай князь Мікалай Вацлаў Радзівіл (1880—1914). І зверху надпіс: «Лёгка зямелька табе, княжэ, у роднай забытай старонцэ».

І гэта нас пераводзіць да іншай часткі гістарычных Кухціч, да сядзібы, якая памятае ўладальнікаў-Завішаў. Бо Мікалай Вацлаў Радзівіл — другі муж апошняй уладальніцы Кухціч, Магдалены з Завішаў.

## Прывід залатой шаблі

Да старажытнага роду Завішаў Кухцічы перайшлі ў канцы XVII стагоддзя, ад княгіні Барбары Горскай. У XIX стагоддзі застаўся апошні прадстаўнік роду Завішаў — Ян Казімір. З-за ўдзелу ў паўстанні 1931 года быў пазбаўлены права на графскі тытул. Але Ян Казімір выгадна ажаніўся з Марыяй Квілецкай, фрэйлінай імператарскага двара. У іх было тры дачкі. Адна, Альжбэта, «з асаблівасцямі», яе нікому не паказвалі. Старэйшую, Марыю, дужа любілі — прыгажуня, сапраўдная свецкая дама, маці вазіла яе з сабою па балях... Трэцюю дачку, па імені Магдалена, лічылі непрыгожай і няўклюднай. Зусім маладзенькай, не пытаючыся згоды, выдалі замуж за графа Людвіка Красінскага, які быў старэйшы амаль на трыццаць гадоў. Шлюб быў няўдалы, без асаблівай прыязнасці. І Магдалену мы ведаем не як Красінскую, а як Магдалену Радзівіл, паводле яе другога замужжа.

Калі Магдалена першы раз аўдавела, ёй было трыццаць чатыры гады. Можна было пажыць згодна з уласнымі інтарэсамі. Падчас падарожжа ў Англію ў 1904 годзе на параходзе яна сустрэла князя Мікалая Радзівіла, нашмат маладзейшага за сябе. Але гэта была сустрэча аднадумцаў і вялікае каханне. Насуперак меркаванню «свету» Магдалена і Мікалай ажаніліся. Разам падтрымлівалі беларушчыну.

А ў 1914-м Мікалай пайшоў добраахвотнікам на фронт і загінуў.



Ягонае цела адправілі сюды, у Кухцічы. Труну сустракалі на станцыі Негарэлае, данеслі сюды на руках. Адпелі і пахавалі князя тут, у капліцы, былым кальвініцкім зборы, пра што сведчыць убачаная намі таблічка.

Дарэчы, хутчэй за ўсё, астанкі князя дасюль тут... Калі ў храме абсталёўвалі падстанцыю, труну дасталі, праверылі на наяўнасць каштоўных прадметаў — а рабавалі яе, падобна, і раней, бо сярод мясцовых жыхароў хадзіла легенда, што князя пахавалі разам з залатой шабляй. Нічога каштоўнага не знайшлі, пакінулі астанкі на месцы, а зверху зацэментавалі.

Шыкоўнага палаца Завішаў, дзе калісьці ўчыняліся балі і збіраліся вядомыя асобы, няма... Азіраемся, спрабуючы зразумець, дзе ён мог стаяць. Рэшткі парку, пагоркі, на адным з якіх сёння стаіць альтанка, магчыма, як і калісьці. Напэўна, палац быў непадалёк ад флігеляў — іх засталося, здаецца, два. Падыходзім да аднаго з іх, якому порцік з чатырма калонамі надае больш-менш «панскі» выгляд. У дом таксама не зайсці, што, зноў паўтару, і добра. Зазіраем праз шчыліны ў дошках, які- мі забітыя вокны: інтэр'еры прадказальна не захаваліся. А вось у сутарэнні прапалзі магчыма... Прычым і ў адным флігелі, і ў другім.

Сутарэнні я люблю... Так што прабіраюся туды, праз завалы цэглы і смецця, асвятляю ліхтарыкам скляпеністыя столі, уяўляю даўнія часы... Калі сюды прыязджалі бліскучыя госці, у тым ліку мінскі губернатар Карнілаў, калі Магдалена Радзівіл, якая насуперак арыстакратычнаму атачэнню прыхінулася да беларушчыны, збірала тут вядомых беларускіх дзеячаў...

Каля ўвахода ў сутарэнні чуваць нечыя галасы. Напэўна, бачаныя намі наверсе такія ж вандроўнікі, купка маладзёнаў, юнакі, дзяўчаты. Чую — абмяркоўваюць, заходзіць ці не заходзіць... Цёмна, страшна... А я тут у цемры медыцырую. Што рабіць? Пачакаць, пакуль сыдуць? Нарада турыстаў зацягваецца, нарэшце чуваць, як пад нечымі падэшвамі хрусціць абваленая тынкоўка... Чакаць надакучыла, асцярожна выходжу з самай цёмнай часткі на больш асветленую...

Дружны віскат сведчыць, што маё з'яўленне заўважанае.

Што ж, няхай распавядаюць пасля, што бачылі прывід Магдалены Радзівіл. Урэшце, турыстычныя аб'екты за кошт легендаў і працвітаюць.

Яшчэ адзін захаваны будынак, стайня, сёння прыстасаваны пад нейкі рамонтны двор: стаяць трактары, машыны, працуюць людзі. Корпус выглядае някепска, чырвоная металачарапіца, пабелка.

## Пад гербам «Лебедзь»

Успамінаецца тут, у Кухцічах, і Максім Багдановіч... Менавіта на грошы Магдалены Радзівіл выдадзены легендарны зборнік «Вянок», і герб Завішаў «Лебедзь» упрыгожвае тытульны ліст волью выдаўцоў. А памятаеце апошні верш Максіма — «Я не самотны, я кнігу маю з друкарні пана Марціна Кухты»? Маладога віленскага друкара Марціна Кухту падтрымлівала ўладальніца Кухціч Магдалена Радзівіл, і ў гэтым сугуччы мне бачыцца цэлы ланцужок алюзій, пачынаючы з друкарні Сымона Буднага.

Пасля рэвалюцыі апошняя ўладальніца маёнтка Кухцічы Магдалена Радзівіл змушаная была з'ехаць за мяжу. Потым савецкія ўлады адмаўлялі ёй у просьбах вярнуцца на Беларусь, бо яна ж падтрымлівала «нацдэмаў». У Польшчы ж яе не прымалі за адданасць беларускай справе і за тое, што лічыла сябе беларускай, аднойчы нават моцна збілі. Памерла Магдалена 6 снежня 1945 года ў манастыры дамініканак у Швейцарыі.

Але хоць бы пасля смерці фундатарка беларускага руху вярнулася на радзіму. У ліпені 2017 года яе прах быў часова размешчаны тут, у старажытным храме Кухціч, дзе астанкі яе ўлюбёнага мужа. Потым перапахаваны ў касцёле св. Роха ў Мінску.

Мы ад'язджаем з Кухціч у спадзяванні, што калі-небудзь вернемся і зойдзем у адноўлены старажытны храм, а ў адным з будынкаў былой сядзібы размесціцца музей Магдалены Радзівіл... А чаму б не памарыць? Магдалена ж тое ўмела.

# БУКВАР — СЛОВА БЕЛАРУСКАЕ

**Вы ведаеце, што буквар прыдумалі беларусы? Так, першы буквар у свеце быў падрыхтаваны менавіта нашымі продкамі, што колькі гадоў таму давёў вядомы даследчык, намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь СУША. І вось днямі на свет з'явілася яго ўнікальная манаграфія пра беларускія буквары. Даследчык эмацыянальна праінфармаваў:**

— Адбылося! Вынік пяці гадоў работы з'явіўся на свет! Ёй аддаваўся амаль цалкам так шмат дзён, месяцаў, гадоў, удзень і ўначы, на выхадных і ў водпуску, дома і ў дарозе...



Навуковае даследванне задумвалася да 400-годдзя першай кнігі пад назвай «Буквар», але істотна пашырылася ў параўнанні з першапачатковай задумай. У манаграфіі 336 старонак вялікага фармату, 8 раздзелаў, 125 параграфаў, 730 ілюстрацый, 1025 спасылак на апублікаваныя і архіўныя крыніцы. Разглядаецца гісторыя айчынных падручнікаў для пачатковага навучання ад старажытнасці да нашых дзён. Вялікая доля такіх помнікаў зусім невядомая нават даследчыкам, а іх ілюстрацыі публікуюцца ўпершыню.

— Каб сабраць звесткі пра беларускія буквары, давялося аб'ехаць шмат краін, працаваць у дзясятках бібліятэк, музеяў, архіваў, шукаць у прыватных зборах і калекцыях, бо даўнія (ды і адносна сучасныя) беларускія падручнікі выключна слаба захаваліся ў самой Беларусі (ды што там, амаль не захаваліся). Па факце былі выкарыстаны ілюстрацыі з 78 дзяржаўных і прыватных калекцый у Беларусі, Аўстрыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Даніі, Ірландыі, Італіі, ЗША, Латвіі, Літве, Польшчы, Расіі, Славеніі, Украіне, Францыі, Чэхіі і Швецыі, — тлумачыць Алесь Суша.

Буквароў захавалася няшмат, бо гэты від кніг ва ўсе часы быў асабліва запатрабаваны і зачытваўся да дзірак. Да таго ж, на думку аўтара манаграфіі, гэта не толькі першая кніга для навучання грамаце, але і крыніца найвышэйшых агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцяў. Па гэтых выданнях можна вывучаць гісторыю культуры і адукацыі нашай краіны.

— Многія з даўніх беларускіх буквароў былі выяўлены адносна нядаўна. Гэта дазваляе нам спадзявацца, што новыя знаходкі яшчэ могуць быць зроблены ў будучыні. Сёння мы можам упэўнена сцвярджаць, што буквар стаў вельмі важнай з'явай у гісторыі айчыннай культуры, паўплываў на развіццё нашага народа, станаўленне яго як нацыі. У той жа час буквар можа быць упэўнена названы і адным з культурных брэндаў Беларусі, сведчаннем выключнай ролі асветы ў жыцці нашых продкаў і сучаснікаў, яскравым дасягненнем творчага генію беларускага народа.

Манаграфію ўжо цяпер можна набыць у кнігарнях, у прыватнасці ў «Акадэмкнізе», і ў выдавецтве «Беларусь». Не прапусціце інфармацыю пра прэзентацыі.

**Матэрыялы падрыхтавала Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## Дещенский сельский исполнительный комитет Узденского района Минской области

**16 февраля 2022 года**

